# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## 1. Дэкларацыя

**Мы, супольнасць свабодных творцаў навукі, асветы, міру і ўстойлівага развіцця гэтай планеты,**

*Разумеючы,* што ў чалавецтва няма іншых, больш важных мэт, чым ўласнае выратаванне, развіццё і непарыўна з гэтым звязанае усёабдымнае пазнанне Вялікай Архітэктуры Сусвету,

*Усведамляючы,* што сродкам дасягнення гэтых мэт могуць з'яўляцца толькі навука (як прыкладная, так і фундаментальная), эстэтычнае развіццё грамадства, павага да нашага агульнага мінулага, сучаснасці і будучыні, вырашэнне ўсіх канфліктаў (пачынаючы ад міжасобасных і заканчваючы міжнацыянальнымі) выключна дыпламатычнымі метадамі без прымянення любога роду гвалту,

*Канстатуючы,* што ў нас няма іншага агульнага дома, апроч планеты Зямля з яе унікальнай экасістэмай, біяразнастайнасцю і выключнымі натуральнымі багаццямі,

*Назіраючы* прагрэсуючую неэфектыўнасць сучаснай сістэмы забеспячэння міру і бяспекі, пачынаючы ад наднацыянальных

арганізацый і заканчваючы міждзяржаўнымі дамоўленасцямі,

З жалем *адзначаючы* нарошчванне ваеннага патэнцыялу і ваенных бюджэтаў асобных дзяржаў і міждзяржаўных аб'яднанняў,

*Мяркуючы*, што перанакіраванне каласальных рэсурсаў з ваенных патрэб на патрэбы развіцця медыцыны, выкаранення галечы і сацыяльнай няроўнасці можа даць грандыёзны штуршок у эвалюцыі чалавецтва ўжо ў кароткатэрміновай перспектыве, стаць гарантыяй выратавання мільёнаў жыццяў і забеспячэння годнага існавання кожнаму члену нашай супольнасці,

*Ацэньваючы* непапраўную шкоду, прычыненую ваеннымі канфліктамі ўсёй чалавечай цывілізацыі: пачынаючы ад каласальных эканамічных страт і заканчваючы вялікай колькасцю загубленых неацэнных чалавечых жыццяў,

*Шкадуючы* аб страчаных магчымасцях, якія мела б чалавецтва ў выпадку адмаўлення ад вайны на карысць мірнага развіцця,

*Дэкларуючы*, што ніякая вайна, за выключэннем вайны з мэтай абароны ад агрэсіўнага пасягальніцтва на ўласныя тэрыторыі і межы, прызнаныя ўсёй сусветнай

супольнасцю, не можа лічыцца справядлівай,

Рашуча *асуджаючы* ўсе формы агрэсіі як асобных дзяржаў альбо міждзяржаўных блокаў, так і недзяржаўных аб'яднанняў,

*Прымаючы* як аксіёму той факт, што кожны чалавек ёсць унікальны па сваёй прыродзе мікракосм са сваімі пачуццямі, перажываннямі, амбіцыямі, надзеямі, страхамі і творчымі ідэямі,

Цалкам *ухваляючы* любую працу, якая вядзе да стварэння, і прынцыпова асуджаючы любыя дзеянні, накіраваныя на знішчэнне плёну такой працы, незалежна ад матываў, якімі апраўдваюцца такія дзеянні,

*Паважаючы* ўсю сістэму нацыянальных, расавых, моўных, гендэрных, духоўных і рэлігійных адрозненняў як галоўную і унікальную адметную асаблівасць нашага рода,

*Прымаючы* канцэпцыю ўстойлівага развіцця ў якасці краевугольнага каменю фарміравання нашай будучыні, будучыні нашых дзяцей і нашага агульнага дома,

*Разумеючы* сваю адказнасць перад нашымі дзецьмі і ўсімі наступнымі пакаленнямі за іх мірнае і шчаслівае існаванне,

*Ведаючы,* што чарговы глабальны ўзброены канфлікт чалавецтва можа не

перажыць,

Мы, дзеячы навукі, асветы і міжнароднай дыпламатыі ствараем гэтае таварыства, прызначанае дапамагаць усім і кожнаму ў яго добрай місіі навуковага і грамадскага прагрэсу, асветы і будаўніцтва міру ў нашым агульным доме.

1. З'яўляючыся незалежным міждзяржаўным добраахвотным аб'яднаннем прыватных асоб, а таксама грамадскіх і навуковых арганізацый, фінансавых донараў, мы заклікаем далучыцца да нас кожнага, хто можа зрабіць свой унёсак у дасягненне нашых мэт.

2. Не валодаючы фінансавымі магчымасцямі, дастатковымі для істотнага ўнёску ў развіццё ўсяго чалавецтва, не маючы мэт здабыцця камерцыйнай выгады і не валодаючы паўнамоцтвамі для манетызацыі плёну нашай дзейнасці, заклікаем наднацыянальныя структуры, дзяржавы, камерцыйныя, грамадскія і навуковыя арганізацыі да ўсялякай падтрымкі (фінансавай, інфармацыйнай, навуковай, арганізацыйнай і маральнай) нашай працы, накіраванай на карысць кожнага з нас.

3. Наша добраахвотнае аб'яднанне пераследуе наступныя мэты, закліканыя служыць прагрэсу нашага грамадства і

згуртаванасці чалавецтва як закладу яго выжывання:

3А. Прызнанне чалавечага жыцця недатыкальным і святым для ўсіх індывідаў і супольнасцей на Зямлі;

3Б. Развіццё ўсіх відаў прыкладной і фундаментальнай навукі — тэхнічнай, натуральнай і гуманітарнай;

3В. Спрыянне паляпшэнню якасці жыцця кожнага члена грамадства, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці і сацыяльнага статусу;

3Г. Пашырэнне ведаў пра сістэму Вялікай Архітэктуры Сусвету;

3Д. Выкарыстанне вынікаў нашых навуковых пошукаў для мірнага прагрэсу чалавецтва;

3Е. Агульнасусветная барацьба з захворваннямі, эпідэміямі і пандэміямі, якія штогод забіраюць мільёны жыццяў;

3Ё. Стварэнне экалагічнай мадэлі развіцця чалавецтва, якая гарантуе выжыванне нашага віду і непрычыненне шкоды нашаму агульнаму дому;

3Ж. Усялякае асуджэнне і адмаўленне ўсіх форм і відаў агрэсіі і гвалту;

3З. Паўсюдная асвета і адукацыя ўсіх членаў чалавечай сям'і дзеля агульнага развіцця;

3І. Паўсюднае эстэтычнае і культурнае

выхаванне грамадства ў атмасферы ўзаемнай павагі да іншых поглядаў, нацыянальнасцей, рас, рэлігій пры поўнай адсутнасці ацэнак і меркаванняў;

3К. Актыўная дыпламатычная праца на ўсіх узроўнях чалавечага супрацоўніцтва з мэтай найхутчэйшага спынення існуючых ваенных канфліктаў і прадухілення новых;

3Л. Супрацьдзеянне любым формам бюракратыі і фармалізму ў пытаннях, якія тычацца навуковых даследаванняў, адукацыі, культуры, будаўніцтва міру і ліквідацыі ўсіх форм няроўнасці і беднасці.

4. Наша таварыства дзейнічае па-за кантэкстам канкрэтных дзяржаў, міждзяржаўных утварэнняў, навуковых, грамадскіх і іншых арганізацый, камерцыйных структур, але ў непасрэдным супрацоўніцтве з імі.

5. Членам нашага добраахвотнага таварыства можа стаць любы дзеяч навукі, асветы і дыпламатыі, а таксама кожны, хто падзяляе нашы мэты і прынцыпы.

6. Кожны член нашага добраахвотнага таварыства абавязаны рабіць свой пасільны ўнёсак у развіццё навукі, асветы і мірных дыпламатычных зносін на сваім узроўні і ў рамках праектаў, арганізаваных нашым таварыствам.

**Адгэтуль і навечна мы клянёмся**

**быць пуцяводнай зоркай для тых, хто прагне лепшай будучыні для сябе і сваіх дзяцей, нават у смяротны час не адыходзячы ні на крок ад веры ў тое, што будучыня залежыць толькі ад чысціні нашых намераў і грандыёзнасці нашых амбіцый, накіраваных не на ўзвялічванне саміх сябе, але на карысць кожнаму.**

*Востраў Роса, архіпелаг Святога Роха, 1 верасня 2017 года*
*Даніял*
*Якуб Глінскі*
*Вольфганг Клаўс*
*Элеанора Кэтрын Эш*
*(і яшчэ 217 подпісаў)*

## 2. Кабінет намесніка Генеральнага сакратара ААН у XXI стагоддзі

Дваццатае стагоддзе гранічна абвастрыла мяжу паміж дабром і злом. У сярэдзіне дваццаць першага гэтая мяжа практычна знікла.

Яшчэ ў той час, калі я хадзіў у школу, нават у галовах дарослых і разумных людзей свет падзяляўся на «нашых» і «тых, чужых». Гэта быў час, калі чарвяк сумневаў ужо пачаў запаўзаць у масавую свядомасць, «жалезная заслона» прыадчынялася, рыпаючы

нязмазанымі паліспастамі, павольна, па міліметры, яшчэ не ўстане даць дастаткова прасторы для новых ідэй і светапоглядаў. «Нашы» былі добрыя. «Тыя, чужыя» — дрэнныя. Мільёнам людзей так было прасцей жыць.

Потым раптам ўсё знікла. Аказалася, што «яны» мала чым адрозніваюцца ад нас. Яны сварацца і мірацца, мараць пра светлае «заўтра». Яны любяць сваіх дзяцей не менш, чым мы. І дрэнных сярод іх ніяк не больш, чым сярод нас.

Гэта было як выбух у замкнёнай прасторы. Ранейшых простых ісцін больш не існавала. З'явілася нешта новае, складанае, захапляльнае і страшнае. Прычым страшнага для многіх аказалася больш. Тыя, хто не змог перастроіцца пад новы свет, закансервавалі сваё ўспрыманне добрага і дрэннага. Яны і зараз жывуць з ім. Гэтыя людзі, напэўна, шчаслівыя. Для іх усё зразумела.

Калі ў Афганістан зайшлі «нашы», гэта было добра.

Калі зайшлі «яны» — дрэнна.

Усё было проста, нават вайна. Былі тыя, хто змагаўся па розныя бакі раздзяляльнай паласы, і мы заўжды ведалі, хто дзе.

Калі стрэлы раздаліся ва Украіне, бакоў не было. Тыя самыя «нашы» з закансерваванай

свядомасцю для прастаты ўспрымання назвалі гэта грамадзянскай вайной. Для ўсіх астатніх быў створаны новы тэрмін — «гібрыдная вайна».

Мяжа знікла. Больш не было варагуючых бакоў, не было нават «нашых» і «чужых». Было пекла. І хоць усе разумелі ў глабальным сэнсе, хто ў каго страляе, сам факт таго, што вайны няма, а ёсць нейкая аморфная «антытэрарыстычная аперацыя», войск няма, а ёсць апалчэнне, якое купіла ў «Ваенгандлі» ракетныя ўстаноўкі і АК апошняй, «сотай», серыі, зламаў успрыманне звыклага свету занадта многім.

Калі была створана Ісламская дзяржава, спачатку ніхто не надаў гэтаму належнага значэння. Гэта чалавечая прырода. Прасцей заняцца тым, што зразумела — аддача будзе большая. Але ўсё аказалася нашмат складаней.

Я мару дажыць да тагодня, калі Ісламская дзяржава стане толькі артыкулам у Вікіпедыі. Пакуль жа арміі прасуюць Блізкі Усход высокадакладнымі бомбамі, якія нібы канструююцца ўжо з убудаваным штабам ІД — куды бомба ўпала, там і штаб ІДЗІЛ

Гібрыдная вайна на самой справе не была вынаходствам дваццаць першага стагоддзя. Яна была заўсёды. Анекдоты пра савецкага лётчыка «Лі Сі Цына» ў В’етнаме —

найлепшае таму пацвярджэнне.

Але яшчэ ніколі яна не была настолькі небяспечная для ўсіх нас.

Другі раз пасля стварэння ядзернай зброі людзі пачынаюць вучыцца жыць з узведзенай бомбай пад уласным крэслам.

Раней сродкам ад параноі была сістэма стрымак і процівагаў, якой аперыравалі ААН і найбуйнейшыя дзяржавы свету. У выпадку гібрыднай вайны гэтая сістэма выявілася практычна бескарыснай. Складана кантраляваць тых, у каго няма імя.

Новых лекаў пакуль не знайшлося.

Самае страшнае тое, што патрэба ў сродках ад гэтай хваробы відавочная сёння далёка не ўсім.

Пакуль хтосьці думае, што, раз страляюць недзе там і на сусветную вайну яно не цягне — значыць не так ужо і страшна, стрэлы пачынаюць гучаць зусім побач.

Калі ў Кіеве снайперы расстралялі дэманстрантаў на Інстытуцкай, я плакаў, зноў і зноў пераглядаючы гэтыя кадры.

Я рабіў гэта наўмысна, каб убіць сабе ў душу нянавісць да тых, хто лічыць гэта магчымым сёння. У сістэме майго светапогляду ёсць месца для кожнага чалавека на зямлі, за адным толькі выключэннем. У маім свеце няма месца тым, хто аддае загад націснуць на курок і хто

лічыць дапушчальным для сябе гэты загад выканаць.

Побач з тымі, хто ўпаў, былі тады мае сябры, і я задыхаўся ад адной думкі пра тое, што яны маглі быць на месцы людзей, якія хапаюцца за горла і падаюць на маставую, кабужо не падняцца.

Вайна, якая пачалася адразу пасля гэтага, так ці інакш закранула ўсіх. Усё часцей на вуліцах маёй краіны на пытанне «Адкуль вы?» гучаў адказ «З Украіны». У збітым транспартніку ІЛ–76 загінуў сябар майго таварыша, у мірным жыцці малады кандыдат навук, які стаў дэсантнікам, каб вайны ў яго краіне не было. Так апасродкавана мы ўбіралі асновы «гібрыднага канфлікту» і задаваліся пытаннем: калі гэта адбылося там, дзе два гады таму ніхто не мог нават ўявіць сабе такога пекла, чаму заўтра тое ж не можа здарыцца ўжо на вуліцах нашага горада?

І гэтыя пытанні задавалі сабе не толькі мы, але і ўсе нашы суседзі. Дзе сродак ад «ветлівых людзей» без апазнавальных знакаў і якая прафілактыка ад гэтай бацылы?

Далёкая вайна раптам стала блізкай.

Многіх гэта прымусіла пасталець.

Сталенне не закранула толькі тых, «закансерваваных».

Для іх свет па-ранейшаму быў просты.

Што мог зрабіць з гэтым я?

Нічога.

Мяне завуць Якуб Глінскі.

Мне трыццаць шэсць гадоў. Я атрымаў доктарскую ступень па паліталогіі ў Варшаўскім універсітэце, затым стажыраваўся ў ЗША, там жа вывучаў сацыялогію.

Калі я быў зусім малады, яшчэ да Варшавы і Стэнфорда, пасля заканчэння бакалаўрыята ў сябе на радзіме я працаваў «хлопчыкам на пабягушках» у сістэме дзяржкіравання, якая захрасла ў савецкай рэальнасці на многія гады наперад. Ужо пасля гэтага мне давялося прымаць удзел у працы розных, у першую чаргу міжнародных, праектаў.

Я бачыў у гэтым сэнс і карысць. Гэта мне падабалася. Напэўна, менавіта таму ў мяне не прыжыліся комплексы маіх аднагодкаў аб немагчымасці перамен. Мяне не паспела раздушыць безвыходнасць, якая кіравала балем у абшарпаных калідорах міністэрстваў. Так-так, вы ўсё зразумелі правільна, у гэтым свеце яшчэ ёсць краіны, дзе нават у міністэрствах са сцен адвальваецца фарба, а да канца года заканчваюцца не толькі папяровыя канверты для карэспандэнцыі, але і гадавы

бюджэт на набыццё новых.

Я наіўны. Занадта наіўны, каб вярнуцца ў гэтую сістэму, бо на кожным кроку ў мяне будзе ўзнікаць пытанне «Божа, ну як жа так?!»

Многія мае прапановы падаюцца ўтапічнымі нават тым, хто быў пазбаўлены сумнеўнага задавальнення жыць і працаваць ва Усходняй Еўропе пасля распаду Савецкага Саюза. Іншыя ж прымаліся на «ўра» толькі з–за таго, што я не абмяжоўваў сябе умоўнымі рамкамі, заўсёды прапаноўваў тое, што не рабіў яшчэ ніхто да мяне, — і яно працавала.

Наіўнасць пайшла мне на карысць і служыла рухавіком майго развіцця. Калі б я застаўся там, дзе пачынаў, наіўнасць была б прычынай маёй галоднай смерці.

Я бываў у розных частках свету. Мяне закідвала туды, дзе вакол ляжалі мерцвякі і шанец атрымаць адпушчэнне грахоў быў вышэйшы, чым у самагубцаў на дахах шматпавярховак. Я бачыў многае. І многае я хацеў бы забыць. Кожны раз мяне прымушала працаваць у такіх месцах толькі адна думка: я тут для таго, каб палегчыць долю людзей, якія жывуць у гэтым пекле, у мяне ёсць магчымасць кінуць усё і вярнуцца на свой хутар у лесе, дзе не страляюць, а ў іх — няма. Мне не было шкада сябе. І чым цяжэй і страшней рабілася, тым больш спартыўнай

злосці і азарту было ў мяне.

На маёй пакуль яшчэ ціхай радзіме расла мая маленькая дачка. Напэўна, я дзейнічаў не так, як належыць бацьку, але я хацеў зразумець усе небяспекі, якія могуць непасільным цяжарам легчы на яе плечы — каб умець своечасова іх прадухіліць. Менавіта таму я часцей бываў там, дзе страшна, убіраючы усю брыдоту чалавечай прыроды, — каб дачка ніколі не ўбачыла ашчэр забойцы ў форме.

Нават цывілізаванае грамадства можа стаць зграяй галодных ваўкоў у лічаныя месяцы, гэта я зразумеў з гранічнай дакладнасцю. Парад украінскіх ваеннапалонных у Данецку стаў апошнім элементам гэтага разумення.

Я адчуваў сябе героем вядомага анекдота пра таксіста, які ведае, як трэба кіраваць краінай, але няма часу — бо таксаваць трэба.

Я ведаў, што трэба рабіць. Не ведаў — як. Дакладней сказаць, не ведаў, дзе знайсці патрэбныя каталізатары працэсу. Была праграма — не было тых, каму яна патрэбная.

Перада мной былі толькі адны дзверы, у якія я мог увайсці, і я стаяў перад імі, утойваючы прывід надзеі глыбока ў душы, роўна як і поўную гатоўнасць сустрэць смех і сарказм. Мне было не прывыкаць.

Сёння, у панядзелак, 20 чэрвеня 2017 года

я стаяў перад будынкам Сакратарыята штаб–кватэры ААН у Нью–Ёрку са змяшанымі пачуццямі.

Мне было добра знаёмае гэтае месца. Я бываў тут шмат разоў раней, і, верагодна, пабываю тут яшчэ не раз.

Трыццаць дзевяць паверхаў са шкла, сталі і бетону на працягу шасцідзесяці гадоў былі цэнтрам свету. Цяпер іх роля з кожным днём сыходзіла ў мінулае. Мары Дага Хамаршольда павольна, але дакладна прыходзіў канец.

Другі Генеральны сакратар ААН быў творцам і, у нейкай ступені, рамантыкам. Менавіта гэта дазволіла Арганізацыі стаць тым, чым яна была столькі гадоў.

Сёння ёй кіравалі нават не палітыкі, а чыноўнікі.

Я добра ведаў гэты тып людзей. У пагоні за захаваннем status quo яны развучыліся рэагаваць на пагрозы. Як вядома, нестандартная небяспека патрабуе прыняцця нестандартных рашэнняў.

Усе рашэнні былі рэгламентаваныя інструкцыямі, прыняцце якіх патрабуе некалькіх гадоў, у той час як праблема прагрэсуе штодня толькі за кошт таго, што яна развіваецца не па інструкцыі.

У маштабах гэтага месца і людзей, якія бывалі тут за апошнія паўстагоддзя, я быў

нікім. Тое, што я нёс з сабой, было, магчыма, не пад сілу рэалізаваць і самому Хамаршольду. Я ішоў сюды толькі таму, што я не ўмею працаваць у стол. Я быў абавязаны паспрабаваць.

Я грукаў у адзіныя дзверы, да якіх мог дацягнуцца.

Намеснік Генеральнага сакратара ААН па палітычных пытаннях доктар Эдмон Эш не быў падобны да таго падцягнутага энергічнага чалавека, якога я шмат разоў бачыў на фотаздымках. У жыцці ён горбіўся, знакаміты бляск вачэй аслабеў, лініі зморшчынак цягнуліся праз увесь твар дадолу, з–за чагоўся энергічнасць сыходзіла на ніштто. Яму было, калі не памыляюся, пяцьдзясят восем гадоў, але выглядаў ён значна старэйшым.

Апускаючыся ў крэсла, ён па–старэчы абцягнуў калашыны штаноў і крэкнуў, канчаткова сеўшы.

Лакіраваная стальніца была абсалютна чыстая, калі не лічыць шырокага манітора, пісьмовага набору і рамкі з фотаздымкам, якая была павернута так, каб выяву бачыў толькі гаспадар кабінета.

У мяне ніколі не атрымлівалася ўтрымліваць стол у такой чысціні больш за дзве гадзіны. Тое, што звычайна называецца «творчым беспарадкам» чароўным чынам

узнікала з ніадкуль, насуперак універсальнаму закону захавання энергіі, аднак, у поўнай адпаведнасці з ім, зусім не спяшалася знікаць нікуды.

Мяне гэта не турбавала, я апраўдваў сябе перадусімі навокал і самім сабой цытуючы эйнштэйнаўскае «Парадак неабходны толькі дурням, геній пануе над хаосам».

Доктар Эдмон Гаспар Эш зусім не быў дурнем. Як і належыць чыноўніку яго ўзроўню і пасады, ён быў больш чым праніклівы, разумны і цынічны. Менавіта цынізм, уласцівы выключна людзям з высокім інтэлектам, быў часткай тых маральных якасцей, якія, як мне здаецца, варта было б пісаць у рэзюмэ кожнага топ–мэнэджэра. Эш быў надзелены гэтай якасцю спаўна.

Кабінет намесніка Генеральнага сакратара самай уплывовай міжнароднай арганізацыі планеты ўяўляў сабой узор аскетызму.

Як я ўжо сказаў, тут знаходзіўся стол гаспадара памяшкання, які ўтвараў з далучаным доўгім сталом для перамоў класічную «Т»–падобную канструкцыю. Для наведвальнікаў было пастаўлена шэсць пар простых у афармленні, але зручных для працяглага сядзення крэслаў. Што тычыцца крэсла самога Эша, то яно адрознівалася ад іншых досыць незвычайнай формай:

перакрыжаваныя ножкі неслі вузкую платформу сядзення без абіўкі, на якую была пакладзена тонкая вязаная падушка, закліканая надаць драўлянай аснове хоць трохі камфорту; выгнутыя падлакотнікі былі быццам працягам ножак, завяршаючы вобраз перакрыжавання; разная спінка была ўпрыгожана барэльефам, якія адлюстроўваў, хутчэй за ўсё, нейкіх міфалагічных персанажаў.

Злавіўшы мой зацікаўлены погляд, Эш дазволіў сабе злёгку ўсміхнуцца, прыпадняўшы куткі вуснаў.

— Вам таксама спадабалася гэтае крэсла, доктар? Вы не першы, каму яно прыйшлося да душы.

— Прызнацца, ніколі не бачыў такіх раней.

— Вы не цікавіцеся антыкварыятам?

— Не магу назваць сябе знаўцам.

— Гэта шмат што тлумачыць. Я паставіў яго у кабінеце сам, калі заняў пасаду намесніка Генеральнага Сакратара дванаццаць гадоў таму. Яно належыць маёй сям'і ўжо чатыры пакаленні. Гэта так званае курульнае крэсла, традыцыя іх вырабу паходзіць з часоў Рымскай Імперыі. Падобныя крэслы рабілі для чыноўнікаў, якія займалі высокія пасады. Што вы пра яго думаеце?

— Яно больш чым вытанчанае і саліднае.

Мяркую, яно павінна быць дастаткова зручным, раз такімі карысталіся людзі, якія мелі шмат улады?

— Вы памыляецеся, доктар. Гэта былі жорсткія, але шмат у чым справядлівыя часы. Курульнае крэсла выглядае сапраўды вытанчана, аднак яно вельмі нязручнае для працяглага знаходжання ў ім. Як вы разумееце, у гэтым былі асаблівы сэнс і іронія, уласцівыя жыхарам адной з самых магутных імперый у гісторыі. Тым самым яны намякалі на тое, што дзяржаўная срака павінна выконваць свае справы як мага хутчэй і эфектыўней, бо менавіта для гэтага яна і была прызначаная на высокую пасаду.

— Для дыпламата і палітыка вы абіраеце смелыя выразы, спадар Эш.

— Ох, калі ласка, я лічу за лепшае пакідаць мудрагелістыя і прыгожыя фразы для трыбун і журналістаў. Вы разумны чалавек, доктар, з вамі можна гаварыць проста, не саромеючыся ў падборы прыгожых сінонімаў да словазлучэння «дзяржаўная срака».

— Ці адносіце вы сябе да такіх?

— Я больш не служу канкрэтнай дзяржаве, доктар Глінскі. З таго часу, калі я пакінуў пасаду міністра замежных спраў Францыі, я працую для кожнай краіны і ні для адной з краін паасобку. Зрэшты, форма змянілася,

сэнс застаўся тым жа: я чыноўнік. Таму, напэўна, выраз, які збянтэжыў вас, смела можна ўжываць і ў дачыненні да мяне. Аднак, не хвалюйцеся, на публіцы я не прамаўляю падобных крамольных слоў. Мне падабаецца філасофія, якую нясе ў сабе гэты прадмет інтэр'еру, вось і ўсё. На жаль, я паддаўся слабасці: як бачыце, я паклаў на сядзенне падушку, каб яна надавала троху камфорту дрэву, прызванаму падтрымліваць маю старэчую пятую кропку.

— Вас жа нельга назваць кабінетным работнікам, доктар Эш.

— Гэта праўда. Я дастаткова рэдка бываю ў гэтым кабінеце. Па праўдзе сказаць, куды больш часу я праводжу ў зручным крэсле самалёта. Аднак, я ж дыпламат, вы памятаеце? Мне можна быць трохі крывадушнікам.

— Гэта не крывадушнасць, доктар — проста жаданне выглядаць лепш ва ўласных вачах. Мне таксама гэта ўласціва.

— Вы праніклівы, mon cher. Але што мне падабаецца ў вас яшчэ больш — вы не імкнецеся дагадзіць мне, пазбягаючы нязручных фраз і пытанняў, як гэта робяць многія іншыя. Хочаце кавы?

— Не адмоўлюся.

Да майго здзіўлення, Эш не пацягнуўся да слухаўкі ўнутранага тэлефона, а пачаў са

значным высілкам падымацца са свайго філасофскага крэсла. Пасля гэтага ён прайшоў да дзвярэй убудаванай шафы, за якой, як высветлілася, размясцілася значных памераў кава–машына.

– Вы самі варыце сабе каву, доктар Эш?

– Ведаеце, бюджэт Арганізацыі Аб'яднаных Нацый хоць і здаецца на першы погляд досыць вялікім, але не з'яўляецца такім на самой справе, — прымаючы пад увагу разнастайнасць напрамкаў дзейнасці нашай місіі. Мой памочнік атрымлівае свае грошы зусім не за тое, што варыць мне каву.

— З вашымі поглядамі не пагодзяцца вельмі многія.

— Хай так. Хіба вас хвалюе, што будуць казаць пра вашы звычкі чужыя людзі?

— Нікольki.

— Я прытрымліваюся тагож меркавання.

Эш акуратна паднёс і перадаў мне сподак з кубкам. Водар кавы быў густы і даўкі, з ледзь улоўнымі ноткамі карыцы.

Я падзякаваў яму позіркам, зрабіў невялікі глыток і прасачыў за тым, як Эш паморшчыўся, калі ўсаджваўся зноў на сваё месца.

— Пяройдзем да справы, доктар. Я ўважліва прачытаў усё, што вы падрыхтавалі для мяне, — ён адкрыў шуфлядку і дастаў з яе шырокі канверт. Даволі нядбайна

пляснуўшы пакетам аб стол, Эш адным рухам вярнуў шуфлядку на месца. — Маю адзначыць, што я азнаёміўся з вашымі матэрыяламі з вялікай цікавасцю. Я па палічках разабраў кожную старонку, кожную прапанову, і ў мяне засталося толькі адно пытанне да вас.

— Якое?

— Што гэта ўсё такое?

— Мне здавалася, што я досыць недвухсэнсоўна выклаў сваю ідэю.

— Доктар, я хачу, каб вы самі, гледзячы мне ў вочы, сваімі словамі распавялі, чаго менавіта вы дамагаецеся.

— Калі ласка. Доктар Эш, матэрыялы, якія я падрыхтаваў для вас, утрымліваюць прапанову па стварэнні новай арганізацыі ў структуры ААН — арганізацыі, якая курыравала б пытанні навуковых і гуманітарных распрацовак, што маюць надзвычайную каштоўнасць для ўсяго чалавецтва ў цэлым. Час гэтых распрацовак ўжо прыйшоў, але рэалізацыя знаходзіцца на зачатковым узроўні.

— Прабачце, я адразу перапыню вас. Вы пералічылі цэлы шэраг сфер, у якіх павінна працаваць гэтая арганізацыя. Зялёная энергетыка, медыцына, прамысловае апрасненне вады, барацьба з голадам, распрацоўка і ўкараненне новых падыходаў у

адукацыі і многае іншае. Але хіба ўсё гэта не з’яўляецца кампетэнцыяй ЮНЕСКА, СААЗ і шэрагу іншых структур, падначаленых Арганізацыі Аб’яднаных Нацый?

— Вы замілоўваеце мяне, доктар Эш. Няўжо вы верыце, што пералічаныя структуры ў стане рэагаваць на свет, які змяняецца хутчэй, чым мы з вамі п’ём нашу каву? Якую ацэнку вы як намеснік Генеральнага сакратара можаце даць дзейнасці ЮНЕСКА?

У вачах Эша з’явілася неразуменне і адчуванне схаванай пагрозы.

— А якую ацэнку, па–вашаму, я павінен даць? Можа быць, вы абвергнеце той факт, што дзякуючы ЮНЕСКА на планеце былі выратаваны сотні тысяч жыццяў, масавая непісьменнасць была ліквідаваная ў дзясятках краін, паспяхова праходзіла ліквідацыя наступстваў велізарнай колькасці гуманітарных катастроф, значна скарацілася колькасць памерлых ад хвароб, якія носяць глабальны характар, дзякуючы прапагандзе ўсеагульнай вакцынацыі дзіцячая смяротнасць знізілася да ўзроўню, які немагчыма было ўявіць сабе яшчэ два дзесяцігоддзі таму?

— Я прашу вас, доктар, не трэба эмоцый. Вы не зусім зразумелі мяне і маю прапанову. Ужо даўно сыходзяць у мінулае тыя часы, калі перспектыўнымі распрацоўкамі, якія могуць

змяніць свет, займаюцца толькі дзяржаўныя лабараторыі. Мы з вамі цудоўна ведаем, што NASA актыўна карыстаецца ракетамі «SpaceX» і што іншая кампанія, якая належыць уладальніку SpaceX Ілану Маску — «Tesla» — зрабіла рэвалюцыю ў аўтамабілебудаванні, што ў корані зменіць наша ўяўленне пра тое, якім павінен быць транспарт будучыні. Прататып кампактнага тэрмаядзернага рэактара распрацавалі ў «Lockheed Martin», сістэму прамысловай ачысткі вады для самых бедных рэгіёнаў свету ўкараняе ўладальнік «Microsoft» Біл Гейтс. Гэты спіс можна працягваць бясконца. Урады аддалі на водкуп прыватным карпарацыям тое, што, здавалася б, не пад сілу нікому, акрамя дзяржавы, і мы бачым, што там, дзе няма ўрадавага кантролю, гэта атрымліваецца значна больш эфектыўна, хутка і рацыянальна. Што застаецца самім урадам? Мабыць, «выказваць глыбокую заклапочанасць чарговымі парушэннямі міжнародных дамоўленасцей» на пасяджэннях Савета Бяспекі і Генасамблеі ААН, прычым, як правіла, гэта датычыцца парушэнняў гэтых самых дамоўленасцей з боку каго–небудзь з пастаянных членаў Савета Бяспекі. Мы бачым, як на пасяджэннях, незлічоных камісіях і міжнародных семінарах прадстаўнікі

дзяржаў толькі і робяць, што выказваюць глыбокую заклапочанасць. Дыпламаты, якія прадстаўляюць свае дзяржавы ў ААН, ператварыліся ў пасмешышчы, якія, не маючы ніякіх рэальных паўнамоцтваў, адбываюць ганаровую ссылку, атрымліваючы за гэта салідны паёк, між тым як сапраўдныя праблемы застаюцца нявырашанымі, а тыя сферы, дзе прадстаўнікі ўсяго чалавецтва павінны аб'ядноўваць намаганні дзеля выгоды кожнай краіны, шчасна рэалізуюцца геніяльнымі энтузіястамі. У мяне складваецца ўражанне, што ўсе даўно забыліся, для чаго на самой справе стваралася Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, і цяпер зацыкленыя на мерапрыемствах, дзе людзі ў дарагіх гарнітурах абмяркоўваюць праблемы імплементацыі норм гуманітарнага права ў ваенных канфліктах — замест таго, каб шукаць шляхі вырашэння і, д'ябал, прадухілення саміх ваенных канфліктаў! Я не адмаўляю бясконцага ўкладу ААН у выратаване мільёнаў жыццяў на планеце, але гэты гіганцкі бюракратычны волат страшна стаміўся і пастарэў. Свет паскорыўся ў развіцці за апошнія дваццаць гадоў настолькі, што арганізацыя, якая абвясціла пастулаты ўстойлівага развіцця як догму для ўсёй

чалавечай супольнасці, згубіла гэта самае развіццё з–пад свайго кантролю, а зараз толькі, падобна да старца, спачывае на лаўрах і з насцярожанасцю сочыць за тым, як падлеткі гуляюць у незразумелыя састарэламу розуму гульні. Гэтыя гульні могуць быць цалкам бяскрыўднымі і нават карыснымі, але карысць ужо не настолькі відавочная апекуну — як мінімум таму, што ён страціў нітку падзей. У сваю чаргу, яны могуць быць надзвычай небяспечнымі, але, зноў жа, гэта губляецца з вышыні старэчага маразму, і той, хто павінен, з дапамогай сістэмы стрымак і проціваг, па–майстэрску кантраляваць гульню, у стане толькі паўшчуваць гарэзлівых вісусаў, не ў стане зразумець, што ўчарашнія свавольнікі заўтра могуць стаць ужо крымінальнікамі міжнароднага маштабу.

Вось што я меў на ўвазе пад неабходнасцю стварэння новай структуры, якая, верагодна, запатрабуе рэформы ўсёй сістэмы ААН. Мы павінны звярнуць свой позірк туды, дзе людзі, якія не патрабуюць сусветнага ўплыву, непрыкметна для нашага погляду змяняюць свет да лепшага, робячы тое, што павінны рабіць мы. ААН стваралася як пляцоўка, дзе найлепшыя дыпламаты ўсіх дзяржаў вырашаюць праблемы, якія не вырашацца самі па сабе, а замест гэтага яны

крычаць «Злодзей!» — «Сам злодзей!» на пасяджэннях Савета Бяспекі. Назавіце мне хоць адзін буйны і небяспечны для ўсяго чалавецтва канфлікт, які шчасна скончыўся з дапамогай Генасамблеі за апошнія дваццаць гадоў? Югаславія? Афганістан? Украіна? Сірыя? Божа, няўжо вы не бачыце, што права «вета» ў Савеце Бяспекі цягне свет на дно?

Больш за тое, няўжо вы не бачыце, што эпоха вуглевадароднага паліва імкліва сыходзіць у мінулае, у той час як краіны, якія недальнабачна адмовіліся інвеставаць у новыя галіны, наіўна мяркуючы, што з гэтай праблемай давядзецца разбірацца толькі нашчадкам (ды і то пасля поўнага вычарпання выкапняў), пачынаюць маштабную грызню, як быццам нафта заканчваецца ўжо сёння і трэба біцца за апошнія кроплі? Чаму ніхто — і, у першую чаргу, Генасамблея ААН — не хоча пакласці гэтаму канец, арыентуючы гэтыя краіны на пераход да новых форм энергазабеспячэння і, як следства, да новых форм эканомікі? Чаму да гэтага часу няма нікога, хто заняўся б гэтымі распрацоўкамі на міждзяржаўным узроўні па–за камерцыйнымі карпарацыямі, хто быў бы гатовы даваць тэхналогіі ў абмен на мірнае развіццё і поўную адмову ад узброеных сутыкненняў, сапраўднай

прычынай якіх з’яўляюцца вуглевадародныя энерганосьбіты?

Вы хацелі, каб я выклаў па пунктах сваімі словамі прапановы, апісаныя ў дакуменце, што ляжыць перад вамі. Што ж, калі ласка.

Па–першае, я прапаную стварыць міждзяржаўную навуковую арганізацыю, фінансаваную з бюджэта ААН, якая будзе займацца як мінімум дзясяткам прыярытэтных для ўсяго чалавецтва напрамкаў даследаванняў і распрацовак, прычым як у рамках дакладных і прыродазнаўчых навук, так і гуманітарных — сацыялагічнымі і паліталагічнымі пытаннямі. Сярод гэтых напрамкаў «зялёная» энергетыка, якая дазваляе цалкам вызваліць свет ад вуглевадароднай паліўнай іголкі, медыцына — перш за ўсё імуналогія і фармакалогія, інжынерыя аднаўляльных рэсурсаў, высокія тэхналогіі, фундаментальная фізіка як базіс для будучых даследаванняў, фенаменалогія канфліктаў і шэраг іншых сфер. Кожная дзяржава на планеце павінна зразумець, што зараз мы не можам накарміць і абагрэць ўсіх, але наш розум здольны даць нам інструменты да суіснавання без грызні за крошкі хлеба. Спецыялісты, якія будуць працаваць у гэтай, безумоўна, найбуйнейшай у гісторыі навуковай арганізацыі, будуць

знаходзіцца па–за юрысдыкцыяй канкрэтных дзяржаў, яны павінны ўсведамляць, што больш яны не ўдзельнічаюць у гонцы за лідарства, што яны працуюць дзеля выжывання і росквіту ўсіх людзей на планеце. Мы можам прыцягваць навукоўцаў з нацыянальных інстытутаў і камерцыйных карпарацый — гэта павінны быць самыя высакааплатныя спецыялісты ў свеце. Аднак мы павінны даць ім яшчэ і тое, што не здольныя забяспечыць ніводная дзяржава і ніводная карпарацыя паасобку — адчуванне таго, што яны працуюць не дзеля чужых палітычных і фінансавых амбіцый, а дзеля навукі і прагрэсу ўсяго чалавецтва. І, паверце мне, доктар Эш, мы прыцягнем лепшых з лепшых, таму што толькі для выбітных навукоўцаў не існуе іншых мэт акрамя радасці пазнання Сусвету.

Па–другое, для стварэння падобнай структуры, на маю думку, будзе неабходна поўнае пераарыентаванне дзейнасці самога сакратарыята ААН: з гэтага часу ён будзе займацца палітычнымі пытаннямі, вырашэннем гуманітарных і ваенных крызісаў, прычым, калі гэта неабходна, — самымі радыкальнымі спосабамі. Мы не адменім права «вета» ў Савеце Бяспекі сваёй воляй і не правядзем зараз такое рашэнне на

Генасамблеі, але рана ці позна ўсім, хто пажадае далучыцца да працы нашай навуковай структуры, стане ясна, што неабходнасць у вайне як сродку адстойвання сваіх інтарэсаў ужо адпала. І, як следства, адпала неабходнасць не толькі ў інстытуце права «вета», але і ў самім Савеце Бяспекі. Навошта ваяваць, калі можна дасягнуць мэт з дапамогай навукі і дыпламатыі? Навошта інвеставаць грошы ў зброю, калі значна прасцей ўкласці гэтыя сродкі ў мірныя шляхі павышэння дабрабыту народаў?

Мы павінны абʼявіць любую вайну заганнай і незаконнай, а любую дзяржаву, якая праявіць агрэсію, злачыннай. Любы агрэсар павінен быць цалкам ізаляваны ад сусветнай супольнасці усімі сродкамі: адмовай ад пастаўкі ці, наадварот, куплі энергіі і тэхналогій, адключэннем ад SWIFT, калі спатрэбіцца — ваенным прымусам да міру і вяртаннем status quo любымі даступнымі сродкамі. Кожны, хто пажадаў бы першым адкрыць агонь, павінен ведаць, што ўжо заўтра яго краіна абрынецца ў каменны век. Хіба гэта не лепшы сродак вырашэння ўсіх спрэчак? Гэта жорстка і недыпламатычна, затое дзейсна. Інструментам для вырашэння любых дамаганняў — тэрытарыяльных, эканамічных, нацыянальных — якраз і

павінна стаць Генасамблея ААН, у гэтым яе сапраўдная роля — быць вярхоўным медыятарам ва ўсіх міждзяржаўных спрэчках. Калі бакі ігнаруюць рашэнні вярхоўнага медыятара, яны павінны сысці прэч з палітычнага поля і забыцца пра любую будучыню ў рамках агульначалавечай сям'і.

Па-трэцяе (і апошняе), мы павінны зрабіць створаную арганізацыю і новую дактрыну міждзяржаўнай палітыкі цэнтральнай кропкай для асвятлення ўсімі інфармацыйнымі рэсурсамі кожнай краіны свету на многія гады наперад. Цяпер чалавецтва не гатовае да такіх радыкальных захадаў, але гэта толькі пытанне свядомасці абываделя. Між іншым, Гітлер убіў чалавеканенавісніцкую дактрыну ў галовы мільёнаў немцаў усяго за некалькі гадоў з дапамогай прапагандысцкай машыны Гебельса і татальнай хлусні. Нам жа не трэба хлусіць, наша дактрына чалавекалюбная, у ёй ёсць месца для кожнага жыхара Зямлі, чаму ж мы не хочам даць ёй ход?

Я замоўк, каб перавесці дух.

— Гэта максімальна кароткі пераказ усяго таго, над чым я працаваў апошні год, таго, што распісана куды больш падрабязна, даходліва і значна менш эмацыйна ў дакументах, якія вы прасілі мяне

патлумачыць, доктар Эш. Я гатовы адказаць на ўсе вашы пытанні, аднак, апярэджваючы іх, я хачу заўважыць, што я ні ў якім разе не чакаю, што вы кінецеся з гэтым пакетам дакументаў у кабінет Генеральнага Сакратара і будзеце патрабаваць іх разгляду на Генасамблеі. Гэта было б занадта ўтапічна нават для мяне.

Эш сядзеў з каменным тварам, слухаючы мяне. За гэтай маскай немагчыма было разгледзець і адгадаць, што адбываецца ў яго галаве: ці было гэта разуменне і адабрэнне, рэзкае адмаўленне і абурэнне, альбо ж саркастычная пагарда.

На хвіліну ў кабінеце ўсталявалася мёртвая цішыня. Затым Эш задуменна падціснуў вусны з тым, каб у наступную хвіліну расцягнуць іх ў лёгкім падабенстве ўсмешкі.

— Вам трэба было нарадзіцца Напалеонам, вы так не думаеце, доктар Глінскі? Вы хочаце зламаць усю сістэму міждзяржаўных адносін адным сваім жаданнем, і — вы дазволіце гаварыць шчыра? — вашы прапановы настолькі ўтапічныя і нават месцамі дзіцячыя, што я не зусім разумею, дзе вы гаворыце сур’ёзна, а дзе жартуеце.

— Вы параўналі мяне з Напалеонам, доктар Эш, гэта прыемна. У мяне ёсць адна рыса, якая яднае мяне не толькі з гэтым выбітным

гістарычным дзеячам, але і з іншымі вялікімі заваёўнікамі ў гісторыі чалавецтва, і яшчэ адна, якая цалкам зводзіць усё падабенства на нішто. Чынгісхан казаў так: «Ведаеш чаго я хачу? Я хачу каб прыгожая дзяўчына ў прыгожых строях пранесла залатое блюда ад Жоўтага мора да Чырвонага і не баялася ані за сваё блюда, ані за сваё адзенне, ані за свой гонар». Чулі гэтую фразу?

— Прызнацца, не.

— Я чуў яе ад прэзідэнта Татарстана Менціміра Шайміева. Не магу паручыцца за тое, што яна на самой справе належыць Чынгісхану, роўна як і за дакладнасць цытавання. Аднак, калі прыняць на веру, што гэта праўда, то я магу сказаць пра сябе, што я сапраўды хацеў бы тагож. Вось толькі, у адрозненне ад Вялікіх мінулага, я не хачу вайны і крыві для будучага росквіту. Я лічу, што дасягнуць яго можна без забойстваў, пакут і гвалту.

— Ухвальна. Але так заяўлялі многія, і ніхто з іх не стаў Месіем — хтосьці быў проста вар'ятам, а хтосьці нарадзіўся нашмат раней за свой час і, не сустрэўшы разумення, памёр у невядомасці і бяссіллі. Вашы прапановы нежыццяздольная, так да каго ж вы можаце аднесці сябе: да вар'ятаў, або да тых, хто жыве не ў сваю эпоху?

— Што ж, не мне судзіць аб уласнай

адэкватнасці. Што ж тычыцца другога варыянту — вы самі не можаце вызначыцца. Спачатку вы сказалі, што я спазніўся гадоў на дзвесце, цяпер сцвярджаеце, што мой час, наадварот, пакуль не прыйшоў.

— Я проста выказаў здагадку. Нават калі вашы прапановы — гэта дзіцячая наіўнасць, здараецца, што і яна таксама па–свойму геніяльная, бо дзіця пазбаўлена штампаў і забабонаў дарослага і бачыць усё максімальна проста, без паўтонаў, якія часам існуюць толькі ў свядомасці старэйшых. Аднак раскажыце мне, чаго вы хочаце? Як вы правільна заўважылі, я не кінуся на прыём да Генеральнага сакратара з гэтымі паперамі, што ж тады я магу зрабіць для вас і вашай работы?

— Мне патрэбна меркаванне дарослага і дасведчанага чалавека, які бачыць усё паўтоны.

— Ваша іронія зусім не была тонкай, доктар Глінскі. Я хачу, каб вы разумелі, што я зараз размаўляю з вамі толькі таму, што ў мінулым мы шматкроць звярталіся да вас і, верагодна, будзем звяртацца ў будучыні — за распрацоўкай сацыялагічных і паліталагічных праграм, якія рэальна працуюць на практыцы. Дарэчы, дазвольце мне трохі адхіліцца ад тэмы. Скажыце, чаму вы не пагадзіліся на пастаянную працу ў

Сакратарыяце? Мы прапаноўвалі вам дастаткова высокія пасады шмат разоў, аднак вы заўсёды адхілялі нашы прапановы. Штокіруевамі?

— Доктар Эш, я нагаварыў шмат непрыемных рэчаў пра сістэму, у якой вы працуеце і ў якую хочаце зацягнуць мяне. Я зарабляю дастаткова грошай для існавання, якое мяне задавальняе, у тым ліку і на кантрактах з вамі. Мне не трэба больш. Але я хачу разумець, што я магу рабіць тое, што лічу патрэбным — нават калі гэта не знаходзіць разумення. Мне даводзілася працаваць у бюракратычнай дзяржаўнай сістэме, калі я быў маладзейшы — ва Усходняй Еўропе непаваротлівы дзяржапарат — гэта, на жаль, норма жыцця. Я быў вымушаны выконваць абсалютна бескарысную, на маю думку, працу, якая ніколі не прыносіла ані задавальнення мне, ані карысці людзям. Так, сэнс Сакратарыята ААН зусім іншы, аднак форма шмат у чым падобная: усе бюракратычныя сістэмы ў свеце амаль аднолькавыя. Я ўжо стаміўся ад гэтай бессэнсоўнасці, фальшу і фальсіфікацыі рэальнай працы ў маладосці, так навошта я павінен паўтараць гэтую памылку цяпер?

— Што ж, па меншай меры гэта было шчыра. Не магу пагадзіцца з вамі ва ўсім,

аднак і спрачацца не стану — у першую чаргу таму, што вы падумаеце, быццам я абараняю Сакратарыят і яго працу як сваё дзецішча, хоць гэта зусім не так. Аднак я падыскутую з вамі з нагоды тэзісаў, якія вы выклалі.

Як я ўжо сказаў, вы хочаце зламаць усю далікатную сістэму міждзяржаўных адносінаў адной толькі сваёй воляй, але вы не разумееце, што для будаўніцтва нават гэтай, мякка кажучы, няўстойлівай сістэмы спатрэбілася сусветная вайна, пагроза ядзернага апакаліпсісу, незлічоная колькасць гуманітарных і ваенных крызісаў. Усё гэта прымусіла краіны хоць неяк дамаўляцца паміж сабой, каб пазбегнуць банальнага знікнення з палітычнай карты свету. Вы, здаецца, забываеце, што ААН — гэта не наглядны орган, не міжнародны паліцэйскі, які з дубінкай стаіць на скрыжаванні, і нават не пажылы дзед, які назірае, па вашых словах, за небяспечнымі гульнямі падлеткаў. ААН — гэта ўсяго толькі перамоўная пляцоўка, дзе бакі, якія маюць свае інтарэсы, адрозныя ад інтарэсаў іншых, могуць вырашаць канфліктныя сітуацыі неваенным шляхам. Могуць — і часам нават імкнуцца гэта рабіць. ААН не можа прымусіць кагосьці да міру, даць ці не даць тэхналогіі і эканамічныя прэферэнцыі ў абмен на адмаўленне ад вайны. Гэта робяць

самі краіны, якія ўдзельнічаюць у перамовах у залах пасяджэнняў Савета Бяспекі і Генасамблеі. Вы першапачаткова пераблыталі магазін адзення з краўцом, дык што вы хацелі пачуць ад нас? Для таго, каб вашы прапановы былі ператвораныя ў жыццё, патрэбныя заявы ў іх падтрымку ад кіраўнікоў найбольш уплывовых краін свету. Вы зможаце забяспечыць такія заявы хоць бы ад кіраўнікоў ЗША, Расіі і Кітая? Асабіста я — не. Заўважце, я нават не кажу пра *ўсе* дзяржавы, якія засядаюць у Савеце Бяспекі, і ўжо тым больш проста пра большасць на Генасамблеі.

Гэта першае. Далей — вы патрабуеце перагляду бюджэту ААН з мэтай фінансавання гэтай арганізацыі. Скажу вам яшчэ больш: мала проста пераглядзець гэты бюджэт і пераразмеркаваць артыкулы. Неабходна радыкальна павялічыць бюджэт. Колькі вам спатрэбіцца на стварэнне такой арганізацыі, матэрыяльнай базы, лабараторый, палігонаў, на прыцягненне спецыялістаў, лагістыку і забеспячэнне? Дзесяць мільярдаў? Дваццаць? Сто? І гаворка ж ідзе толькі пра пачатковую стадыю. Бюджэт ААН на 2014–2015 гады склаў пяць з паловай мільярдаў долараў. А хто працягне фінансаванне арганізацыі міратворчых місій, неабходнасць у якіх не знікне нават

пры ўмове рэалізацыі вашых мар яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў? Хто будзе працягваць фінансаванне дзеля рэагавання на гуманітарныя крызісы? На працу Сакратарыята, Генасамблеі і Савета Бяспекі? У рэшце рэшт, чаму вы забываеце пра тое, што гэты самы бюджэт складаецца з унёскаў усё тых жа краін–удзельніц? Таму такое рашэнне прымаецца імі ж на Генасамблеі, а не ў кулуарах офіса ў Нью–Ёрку ці Жэневе. Вы павінны пераконваць не мяне, а краіны–донары. І, паверце, калі здарыцца цуд і вы пераканаеце іх, Сакратарыят не толькі не будзе мець жадання, але і юрыдычнага права перашкаджаць рашэнню Генасамблеі. Але для гэтага трэба быць не проста Напалеонам, з якім я вас параўнаў першапачаткова. Для гэтага вы павінны мець як мінімум аўтарытэт Напалеона, Гая Юлія Цэзара, Аляксандра Македонскага і прэзідэнта ЗША ў дадатак. Прабачце ўжо мяне за шчырасць, але пакуль вы не валодаеце такім аўтарытэтам.

Вы бачыце ідэальныя карцінкі ўтапічнага свету, у якім няма вайны і ўсім хапае хлеба, вады і бензіну. Ах, выбачайце, у сістэму вашага свету бензін не ўпісваецца, я забыўся. Але мы жывём у рэальнасці, закіданай інфармацыйнымі зводкамі з палёў бітваў і месцаў захопу закладнікаў. І нафта

тут усё яшчэ найкаштоўнейшы рэсурс, а не анахранізм, якім яе бачыце вы ўжо сёння. Чалавек забіваў заўсёды, і, верагодна, будзе забіваць надалей, я не бачу перадумоў для таго, каб змяніць гэтую сітуацыю. У гісторыі не было зваротнага і, баюся, не будзе. Наша задача — зрабіць так, каб прадухіліць не ўсе смерці, а тысячу, дзве, тры, сто тысяч; каб мужчыны забівалі толькі ўзброеных мужчын, а не бяззбройных жанчын, дзяцей і старых. Каб, нарэшце, палегчыць пакуты тых, хто ўсё-ткі трапіў пад абстрэл, за кошт забароны боепрыпасаў са змешчаным цэнтрам цяжару, супрацьпяхотных мін і бомб, баявым элементам якіх з'яўляецца белы фосфар. Чаму вы лічыце, што нашых намаганняў недастаткова?

— Ці спрабаваў хто-небудзь у гісторыі, доктар Эш, пераадолець цягу чалавека да забойства за кошт страху перад адсутнасцю будучыні ці, наадварот, прэферэнцый, пры якіх забойства стане бессэнсоўным? Альбо мы так і будзем вечна скуголіць аб тым, што ў гісторыі не было такіх прэцэдэнтаў і не будзе ніколі — па меншай меры пры нашым жыцці? Мне здаецца, што гэта замкнёнае заганнае кола, якое мы нават не хочам паспрабаваць разарваць.

— Ну што ж, кідайце выклік сістэме, доктар Глінскі. Калі ваша мара — барацьба з

ветракамі, то я ўмываю рукі. Дарэчы, я не скончыў свае высновы. Апошняй вашай прапановай было ўнушэнне абывацелям ва ўсім свеце выключнай важнасці і патрэбнасці вашай праграмы. Няўжо вы не ведаеце, наколькі небяспечна гуляць са свядомасцю мас, нават маючы на ўвазе добрыя мэты? Усе эксперыменты, якія праводзіліся на гэтую тэму, былі праваленыя з трэскам. Некаторыя скончыліся вялікай крывёй і прывялі да незваротных наступстваў. Вы хочаце паспрабаваць яшчэ раз?

— Паўтаруся, я не заклікаю да гвалту, змены дзяржаўных межаў, пераследу па тых ці іншых прыкметах. Мая дактрына — гэта гуманізм ва ўсіх яго праявах. Роўныя магчымасці для кожнага — так, гэта агучвалі многія, але ніхто з іх не думаў, што будзе, калі даць гэтыя самыя роўныя магчымасці людзям ва ўмовах дэфіцыту прадуктаў харчавання, энергіі і доступу да выгод, з якім мы сутыкаемся ўжо цяпер. Я думаю пра тое, як вырашыць корань праблемы, а не яе следства, як зрабіць так, каб больш не было сэнсу змагацца за стратэгічныя крошкі.

— Вы і сапраўды ўявілі сябе месіем.

— Не, усяго толькі чалавекам, які не блытае хвост з галавой.

— Адкуль вы ведаеце, што на самой справе

што? І чаму вы лічыце, што толькі вы бачыце свет у адзіна правільным святле?

Я ўздыхнуў.

— Я разумею, доктар Эш. Вам здаецца, што я вар'ят. Але ж вар'яцтвам было б патрабаваць ад вас імгненных дзеянняў, а я ўсяго толькі прапаную сваё бачанне праблемы, не чакаючы, што вы будзеце ўвасабляць у жыццё ідэі, якія падаюцца вам утапічнымі.

Эш раптоўна абмяк у сваім крэсле.

— Вы нават не ўяўляеце, як моцна я стаміўся за гэтыя дванаццаць гадоў. Калі я заняў свой пост, я быў энергічны, як шчанюк джэк–расэл–тэр'ера. На твары не было маршчын, а на галаве — ніводнага сівога воласа. Зараз я стары, які з цяжкасцю перасоўваецца з кабінета ў аўтамабіль. Можа быць, вы якраз мелі на ўвазе мяне, калі параўноўвалі ўсю сістэму ААН з састарэлым маразматыкам?

— Крый божа. Я не схільны атаясамліваць цэлую сістэму з адным чалавекам.

— Я ў апошні час часта задаю сабе пытанне, чаму я так рэзка пастарэў за гэтыя гады. Задаю — і ніяк не магу знайсці адказу. Прабачце за бестактоўнае пытанне, колькі вам гадоў, доктар?

— Трыццаць шэсць.

— Вы зусім малады. Але чаму ў вас ужо паўгалавы пасівела, хоць вам яшчэ нават не

споўнілася столькі гадоў, колькі было мне, калі я заняў крэсла намесніка Генеральнага сакратара?

Я нацягнута ўсміхнуўся.

— Усё занадта проста, доктар Эш. У вашым жыцці ніколі не было безнадзейнасці, якая ціснула б на вас са дня ў дзень, з года ў год. Гэты прэс зваліўся на вас разам з непасільнай ношай вашай пасады. Вы нарадзіліся ў нябеднай сям'і, хадзілі ў прыстойную школу, вучыліся ў Сарбоне, ваша кар'ера ішла ўгору і вы не думалі ні пра што, акрамя як пра наступную прыступку вашага развіцця. Усё ваша жыццё складалася з ланцужка «праблема–рашэнне–крок на наступны ўзровень». Вы не апускалі галаву, таму што бачылі перад сабой цікавыя задачы і іх рашэнне. Вы не ведалі галечы, закона джунгляў звычайнай школы для простых смяротных у бедных краінах. Для вас ніколі не існавала маральнага выбару, які ўзнікае ў чалавека, што толькі атрымаў зарплату і ў тую ж хвіліну думае не пра тое, на якія добрыя рэчы ён яе выдаткуе, а пра тое, як яму паступіць: заплаціць за чарговы рамонт старой машыны, адкласці смешныя капейкі на далёкую і амаль нязбытную мару або плюнуць на ўсё і спусціць усе грошы на дзіця, якому так хочацца купіць на лета новую вопратку і вялікую цацку. Вы ніколі не

ведалі, як гэта — мецць на руках толькі што атрыманыя капейкі, думкамі ўжо быць там, дзе ад іх не засталося нічога, а наступная зарплата толькі праз тыдзень. Вы не ведалі, што ўласнае жыллё, якое памерам і якасцю ледзь пераўзыходзіць сабачую будку, можа быць нязбытнай марай. Не ведалі, што падарожжы нават у суседнія краіны могуць быць страшным цяжарам для сямейнага бюджэту, адужаць які практычна не ўяўляецца магчымым, асабліва калі на руках малое дзіця, якому патрэбнымінімальны ўзровень камфорту і запас асабістых рэчаў — чаго не могуць прапанаваць малабюджэтныя авіярэйсы. Божа, ды пра што я кажу, вы нават не зусім можаце ўявіць сабе краіну, у якой няма лаўкост–перавозчыкаў! А так жывуць мільёны, калі не мільярды людзей ва ўсім свеце! Калі б вы паглядзелі на простых мужчын і жанчын вашага ўзросту ў маёй краіне, вы жахнуліся б ад таго, якімі старымі яны выглядаюць, калі, вядома, наогул яны дажываюць да такіх гадоў.

Я сам так пражыў больш за палову свайго жыцця. Але я змог вырвацца з гэтай страшнай багны і пазбавіцца таго самага прэсу, які ціснe на звычайных людзей штосекундна, нават у моманты радасці, а ўжо тым больш у хвіліны няшчасця. Я сказаў бы,

што гэта поспех, але я не веру ў яго — толькі ў пякельную працу, якая не пакідае сіл ні на што: ні на падарожжы, ні на забавы, ні, часам, нават на сям'ю.

А гэта ж норма для многіх там, дзе само асяроддзе не дае думкі пра тое, што бывае іншае жыццё. Яны рана старэюць і рана паміраюць, пакінуўшы самае святое, што было ў іх — свае нерэалізаваныя мары. Менавіта яны — мары — згінаюць іх пазваночнік, шчодра пасыпаюць інеем галовы, тупым нажом размякчаюць лінію зморшчын на твары. І так з года ў год, з пакалення ў пакаленне. Вы пражылі шчаслівае жыццё, у якім не было гэтага прэсу, здольнага давесці да вар'яцтва. Я адказаў на ваша пытанне?

Эш пацягнуўся і ўзяў са стала рамку з фатаграфіяй.

— Вы дарэмна гаворыце пра мяне як пра чалавека, які не бачыў пакут у сваім жыцці. Па службе мне, як, зрэшты, і вам, даводзілася бываць у такіх месцах, у параўнанні з якімі тое, што вы апісваеце, падалося б раем проста таму што ёсць само жыццё і ёсць праца, якая можа хоць неяк гэтае жыццё забяспечыць.

— Вы бачылі гэта, доктар Эш, а бачыць і быць часткай гэтага — дзве вялікія розніцы. Вы заўсёды вярталіся, вам было куды вярнуцца. У людзей, якія жывуць такім

жыццём, вяртацца няма куды.

— У вас ёсць дзеці, доктар Глінскі?

— Дачка.

— Колькі ёй?

— Нядаўна споўнілася пяць гадоў.

— І вы часта бачыцеся з ёй?

— Не так часта, як хацелася б. Мы з жонкай развяліся, калі дзіцёнку было два гады. З таго часу ў мяне атрымліваецца быць з ёй у лепшым выпадку два–тры месяцы на год.

— У мяне таксама дачка. Яна дарослая, ёй дваццаць дзевяць. Яна даўно жыве сваім жыццём, і я бачу яе значна радзей, чым вы сваю, доктар. Яна не шкадуе аб гэтым. Я быў дрэнным бацькам: знікаў на працы, прычым мая кар'ера заўсёды прадугледжвала, што большую частку свайго часу я буду праводзіць далёка ад дому. Яна вырасла без майго асаблівага ўдзелу. Без яго ж вывучылася, занялася працай у гуманітарных місіях. Мне часам здаецца, што яна мае на мяне крыўду за тое, што мяне было так мала ў яе дзяцінстве. Але часцей я думаю, што ёй ужо даўно ўсё роўна. Яна згадвае мяне на святы, часам тэлефануе, але не больш за тое. Я сам вінаваты ў гэтым.

Эш працягнуў мне рамку. Я ўзяў яе і з цікавасцю зірнуў на выяву. Гэта быў не сучасны фотаздымак, а старая картка, з якой на мяне глядзела дзяўчынка гадоў дзесяці

побач з самім Эшам, якому было тады на дваццаць гадоў менш, а выглядаў ён маладзейшым гадоў на трыццаць пяць. Дачка шчаслiва смяялася ў руках бацькi.

— Яе iмя Элеанора. Я нават дакладна не ведаю, у якой частцы свету яна знаходзiцца зараз: у Афрыцы або ў Азii.

— Дзiўнае iмя для французскай дзяўчынкi.

— Мама Элi была амерыканка. Яна была вельмi таленавiтай i амбiтнай жанчынай. Многiя, дарэчы, укладваюць у слова «амбiцыйнасць» негатыўны сэнс, хоць я лiчу, што гэта цудоўная якасць, якой павiнен валодаць кожны чалавек. Вялiкiх учынкаў не бывае без амбiцыйных памкненняў. Мая жонка не здзейснiла нiчога вялiкага, хоць яна марыла пра тое, каб быць карыснай усiм людзям. Гэта яна выбрала iмя Элеанора — у гонар свайго кумiра, Элеаноры Рузвельт.

— Больш чым годны прыклад для пераймання.

— Я быў супраць. Але якое права голасу я меў, калi не мог нават павiншаваць дзяўчынку на Каляды? Яна настаяла, i я змiрыўся. Зрэшты, мне здаецца, маёй дачцэ падыходзiць гэтае iмя. Яна амбiцыйная, валявая, iмклiвая. Не такая, як я. Я тройчы падумаю, перад тым, як нешта зрабiць, але гэта асаблiвасцi маёй iнэртнасцi i, што тут

хавацъ, майго ўзросту. Яна ж паступае так, як лічыць патрэбным, рашэнне яна прымае імгненна і заўсёды яно аказваецца правільным. Напэўна, гэта свайго роду інтуіцыя, якой Гасподзь надзяліў мяне куды менш, чым яе. Усе мае рашэнні дакладна выверанын і прааналізаваныя. Яна абыходзіцца без пакутлівых роздумаў — проста робіць тое, што лічыць патрэбным, і ніколі не памыляецца.

— Вы шкадуеце аб тым, што ваша жыццё склалася менавіта так?

— Хутчэй не, чым так. Ведаеце, я прагматычны чалавек. Я зрабіў шмат важных рэчаў, якія прынеслі карысць многім людзям — хай мае дзеянні, як вы толькі што пераканаўча мне даказвалі, былі зусім не такімі эфектыўнымі, як хацелася б. Мая дачка вырасла самастойным і незалежным чалавекам, які ніколі не згубіцца ў жыцці. Я шкадую толькі аб тым, што так мала бачыў яе, калі яна была дзіцем. Гэта, хутчэй, эгаізм, чым нешта іншае, але адзіныя дні, якія я хацеў бы змяніць, былі менавіта тады. І яшчэ я шкадую, што так і не даў маці Элі таго, што яна хацела — адчування моцнай сям'і. Яна памерла некалькі гадоў таму, так і не дачакаўшыся мяне з чарговай камандзіроўкі. Цяпер мы не зможам разам сустрэць старасць, а значыць і

мне засталося толькі працаваць да апошняга моманту, бо знік адзіны сэнс майго выхаду ў адстаўку.

— І вы будзеце чапляцца за працу ў Сакратарыяце толькі таму, што баіцеся старасці?

— Я баюся не старасці, я баюся старасці ў адзіноце. Гэта сапраўды мая фобія, і я не хаваю яе. Зрэшты, ці буду я працаваць у Сакратарыяце, вырашаць не мне. Мне важны сам факт працы.

— Дзеля самой працы, а не дзеля выніку?

— Я палічыў бы за лепшае не адказваць на гэтае пытанне. Вынікі ацэняць пасля таго, як мяне не стане.

— Вам жа больш няма чаго губляць, доктар Эш? Вы дасягнулі вяршыні свайго жыцця, вам няма чым рызыкаваць. Вы намеснік Генеральнага сакратара ААН, у вас мноства рычагоў уздзеяння. Я гатовы проста зараз перадаць вам поўны пакет дакументаў і права на іх выкарыстанне, гатовы забыцца аб сваім аўтарстве на іх і ніколі больш не ўспамінаць аб ім. Там распісана ўсё: стратэгія, планаванне, бюджэт, чаканыя вынікі і рызыкі. Дайце гэтым дакументам ход, няхай іх абмяркуюць усе зацікаўленыя. Мне не патрэбныя лаўры пераможцы, я хачу толькі, каб мая распрацоўка прынесла карысць людзям. Хай рэалізуюцца не ўсе мае

прапановы, хай гэта будзе выглядаць не зусім так, як я ўяўляў, проста дайце шанец усім нам!

— Вы памыляецеся. Мне ёсць чым рызыкаваць. Пагадзіцеся, ёсць розніца паміж старым вар'ятам і намеснікам Генеральнага сакратара найбуйнейшай міждзяржаўнай арганізацыі ў гісторыі чалавецтва. Я хацеў бы застацца ў памяці людзей не першым, а другім. Мы можам абмяркоўваць з вамі ў сяброўскай гутарцы любыя ўтапічныя ідэі, але паверце, як толькі я — не вы! — вынесу іх з гэтага кабінета, Генасамблея і Савет Бяспекі вырашаць, што я з'ехаў з глузду. Я страчу ўсё, што стварыў за сваё жыццё ў лічаныя дні. Чаму вы думаеце, што я павінен нават не рызыкаваць — гарантавана знішчаць сваё жыццё і сваю рэпутацыю?

— Дапусцім. Дайце тады хоць бы савет, што мне рабіць далей?

— Вам? Вяртацца да сваёй дачкі і не паўтараць маіх памылак. Рабіце тое ж, што і раней: займайцеся распрацоўкай праектаў, якія сапраўды працуюць і прыносяць карысць.

— Але ж гэтага недастаткова.

— Лепш малая карысць, чым ніякая, хіба не так?

— Іншымі словамі, вы раіце мне знішчыць прапанаваны вам дакумент і ніколі больш не

вяртацца да яго, каб не стаць пасмешышчам?

— Навошта знішчаць? Захавайце яго. Быць можа, аднойчы свет будзе гатовы да перамен і вашы прапановы знойдуць патрэбных людзей.

— Свет ужо змяняецца, доктар Эш. Да перамен павінен быць гатовы не ён, а мы.

— Хіба не мы з вамі — не дэлегаты Генасамблеі, не палітыкі, навукоўцы, рабочыя і хатнія гаспадыні — і ёсць свет? Вы маеце поўнае права не прыслухоўвацца да маіх парад. Але вы павінны ведаць, што грамадства не любіць Дон-Кіхотаў. І калі аднойчы вас заклеймяць, у гэтым будзеце вінаватыя толькі вы.

— Я і так не прывык нікога вінаваціць у сваіх бедах, доктар Эш. Я ўсё жыццё выцягваю людзей з іх бед, куды іх зацягнулі іншыя, але мае няўдачы належаць толькі мне.

— Гэта ваша крэда?

— Не, гэта ўсяго толькі вынік доўгіх разважанняў. Я прыйшоў да высновы, што, калі вінаваціць кагосьці ў тым, што ў цябе не атрымліваецца выцягваць самога сябе за валасы наверх, шанцы на поспех рэзка змяншаюцца.

— Вы амбіцыйны чалавек, доктар Глінскі, і мне гэта падабаецца. Мне было б шкада, калі б вы, працягваючы ўпарціцца ў прасоўванні

сваіх ідэй, сталі пудзілам для грамадства і засталіся ўбаку ад той працы, у якой вы, несумненна, можаце зрабіць яшчэ вельмі многае. Аднак пакуль што іншы вынік мне ўяўляецца сапраўднай фантастыкай. Я прашу вас, кіньце вашу задуму.

Я падняўся.

— Я падумаю над гэтай прапановай, спадар Эш. Прашу вас, не ўставайце, мяне не трэба праводзіць. Дазвольце, я толькі забяру ў вас свае паперы.

Эш кінуў на іх задуменны погляд.

— Вы не маглі б пакінуць іх мне?

— Навошта яны вам? Вы ж не бачыце ў іх ніякай перспектывы.

— Я не сказаў, што ў іх няма рацыянальнага зерня, доктар Глінскі. Я казаў, што я не бачу перспектывы рэалізацыі вашай прапановы, але гэта не значыць, што яна пазбаўленая сэнсу і практычнай карысці. Скажам так, я хацеў бы пакінуць іх для асабістага карыстання і я абяцаю, што інфармацыя, якая там утрымліваецца, не будзе выкарыстана не па прызначэнні.

— Ці значыць гэта, што ў мяне ёсць шанец, што аднойчы вы скарыстаецеся гэтай інфармацыяй так, як мы абмяркоўвалі з вамі?

— Баюся, што не. Я проста прашу вас зрабіць мне падарунак.

— Штож, мне не шкада паперы, доктар Эш.

— Вы дорыце мне не паперу, а матэрыял для разважанняў. Гэта непамерна больш каштоўны прадукт.

Я падсунуў сваё крэсла да стала і падаў руку намесніку Генеральнага сакратара па палітычных пытаннях доктару Эдману Гаспару Эшу. Ён паціснуў яе, усё–ткі падняўшыся на ногі.

— Выкарыстоўвайце гэтыя паперы так, як вам будзе заўгодна, доктар Эш.

— Дзякуй. Думаю, хутка мы зноў папросім вашай дапамогі, Якуб. Будзьце на сувязі.

— Не ў бліжэйшы месяц. Я планую адпачыць ад усягоў сваім лесе.

— Дамовіліся. Не ў бліжэйшы месяц. Дзякуй вам за гэтую гутарку.

— Дзякуй вам. Бывайце.

Эш кіўнуў.

За мной зачыніліся дзверы. Тыя самыя, адзіныя, у якія я мог пастукацца з надзеяй на разуменне.

Я вяртаўся дамоў.

## 3. Палкоўнік Гор

Быў вечар, калі я пакінуў кабінет доктара Эша. Самалёт, на якім я павінен быў вяртацца дадому, вылятаў толькі наступным днём з Нюарка. Мяне чакаў

дзевяцігадзінны пералёт на 767–м і чатырохгадзінная стыкоўка ў Вене.

З дзяцінства самалёты прыводзілі мяне ў захапленне. Пачуццё глыбокай павагі перад імі не прайшло да гэтага часу, але боязь палётаў я так і не змог перамагчы. Я ненавідзеў палёты. Ненавідзеў лятаць у прынцыпе, таму знаходзіцца ў салоне самалёта больш за тры гадзіны было для мяне непераноснай пакутай.

Што праўда, страх палётаў быў у мяне не заўсёды, ён з'явіўся раптоўна, на пустым месцы. Мне хапіла некалькіх дзён зносін з чалавекам, які пакутаваў на жудасную аэрафобію, падчас адной з маіх самых першых замежных камандзіровак. Тады мне было дваццаць пяць. З тых часоў на ўзлётна–пасадачнай паласе перад разгонам я заўсёды змагаўся з панічнай атакай, прымушаючы сябе дыхаць настолькі глыбока і павольна, наколькі гэта было магчыма. І яшчэ я ніколі не глядзеў у ілюмінатар пры ўзлёце. Спрабаваў прымусіць сябе расплюшчыць вочы, але не мог. Я так ніколі і не бачыў моманту адрыву самалёта ад зямлі.

Трохі супакойваўся я толькі калі самалёт клаўся на зададзены эшалон. Ужо на пасадцы я адчуваў сябе ў поўным парадку, хоць галавой я заўсёды разумеў, што гэта самая небяспечная частка палёту. Але блізка

зямля была для мяне пазбаўленнем ад маіх пакут, і сваім знаёмым я жартам казаў, што на пасадцы ўжо не страшна падаць: што такое пару соцень метраў уніз? Суразмоўцы ўсміхаліся.

Зрэшты, я заўсёды ведаў, чаму мне страшна лятаць. Я намагаўся кантраляваць сваё жыццё і ступень небяспекі, якой я яго падвяргаю. Некалькі разоў я быў за крок ад сур'ёзных аварый, знаходзячыся за рулём, і ў такіх выпадках я заўсёды сам змагаўся за сваё жыццё — хай на рэфлексах і не аддаючы сабе справаздачы ў сваіх дзеяннях, паспяваючы спалохацца толькі пасля таго, як усё было ўжо скончана. Думка пра падзенне самалёта, калі ты нічога не можаш зрабіць для свайго выратавання, была для мяне непераноснай, і менавіта гэтай вымушанай пакоры няўхільнаму лёсу я баяўся больш чым самой смерці.

Заўтра мне трэба было зноў самавольна замкнуць сябе ўнутры вялізнага лайнера на паўдня і спрабаваць не даць паніцы вырвацца вонкі.

Гэта было цяжка не толькі маральна, але і фізічна. Улічваючы тое, што я толькі ўчора прайшоў праз гэтую працэдуру і не паспеў як след адысці ад стомы, у мяне не было ніякіх іншых жаданняў, акрамя як зваліцца на ложак і заснуць, набіраючыся сіл перад

будучай экзэкуцыяй. Я ведаў, што паспаць у самалёце ў мяне ўсё роўна не атрымаецца.

Гасцініца «Hampton inn», дзе я ўчора спыніўся, знаходзілася ў двух кроках ад Сакратарыята, на 42-й вуліцы. Гэта было не самае таннае месца з усіх магчымых, але яно было ідэальнае у плане размяшчэння і выгод у выпадку рабочай паездкі. Зрэшты, дарагой гэтую гасцініцу назваць таксама было нельга: яна цалкам адпавядала маім фінансавым магчымасцям. Я жыў у ёй і раней, у свае папярэднія паездкі ў Нью-Ёрк, і не хацеў змяняць звычкі.

Сказаць па праўдзе, я быў зусім не такі пераборлівы ў пытаннях выбару гатэляў. Я памятаў свае першыя камандзіроўкі ў сябе на радзіме, у якіх я мог дазволіць сабе толькі месца ў клапоўніку, які, па дзіўным непаразуменні, насіў ганарлівую назву «гасцініца». У такіх установах было страшна ўсё: невыносная спякота летам і холад, які прабіраў да касцей, узімку, процьма казурак у нумарах, ложак, старэйшы за самога пастаяльца, і пастаяннае карканне варон пад акном. Мяне собіла спыніцца ў такой праз шмат гадоў пасля знаёмства з гэтым тыпам гасцініц — тры гады таму, і я быў нямала здзіўлены, што за дзесяць гадоў не змянілася нічога. І пра даброты цывілізацыі накшталт кандыцыянераў і бесправаднога інтэрнэту

адміністратар тут добра калі чытаў у газетах. Так жыла і, мабыць, будзе жыць яшчэ доўгія гады правінцыя ў мяне дома. Я не сталічны сноб, але пасля такіх месцаў практычна любыя гасцініцы цалкам адпавядалі маім сціплым патрабаванням.

Адкрыўшы дзверы магнітнай карткай, я закінуў партфель у кут, сцягнуў туфлі, не расшнуроўваючы іх, і паваліўся на шырокі ложак.

Я дрэнна сябе адчуваў, што было характэрна для мяне пры моцнай стомленасці. Вельмі балеў страўнік і нылі цягліцы ў нагах — тыповыя сімптомы маёй дарожнай хваробы.

Хацелася забрацца пад коўдру і забыцца хутчэй, але ў мяне не было сіл нават зняць адзенне, не кажучы ўжо пра тое, каб схадзіць у душ — чаго настойліва патрабавала спатнелае цела.

Так я і ляжаў амаль дзве гадзіны, пагрузіўшыся ў свае думкі.

Вынік сённяшняга дня быў цалкам заканамерны і чаканы. Я спадзяваўся незразумела на што, замаўляючы квіткі ў Нью–Ёрк. Надзеі больш не было, і мне трэба было вырашыць, што рабіць далей.

Я вырашыў пакінуць пакутлівыя разважанні на час палёту.

Верагодней за ўсё, я быў вымушаны так ці

інакш паслухацца парады Эша. Самая высокая інстанцыя, у якую я мог звярнуцца, аказалася безуважнай да мяне.

Мне быў патрэбны час, каб прымірыцца з гэтым.

Гэты час я хацеў правесці на радзіме.

Я раптам пакутліва захацеў дадому.

Там, у васьмі тысячах кіламетраў ад Нью–Ёрка, мяне чакае двухпавярховы драўляны домік, які стаіць на краі ляснога масіву. Я рэдка бываў у ім, марнуючы большую частку свайго часу ў паездках, і ад гэтага мяне яшчэ больш цягнула да яго.

Я прадаў кватэру ў горадзе і ўклаў грошы ў будаўніцтва, як толькі зразумеў, што мяне больш нішто не ўтрымлівае ў шэрых панэльных шматпавярхоўках — ні жаданне быць сярод іншых людзей, ні неабходнасць ездзіць кожную раніцу на працу ў пэўнае месца, ні, тым больш, сумніўнае задавальненне хадзіць у супермаркеты, нібы на экскурсію.

Мне было добра аднаму.

І яшчэ лепш мне было з дачкой.

Я вяртаўся, каб прысвяціць ёй увесь наступны месяц.

А потым, растварыўшы ўсю сваю стомленасць ў лесе, зноў заняцца тым, што ў мяне атрымлівалася добра.

Я заснуў, так і не разаслаўшы ложак і не

зняўшы вопратку.

Сняданак я, вядома, праспаў. Праспаў бы і абед, калі б ён уваходзіў у кошт майго нумара.

Калі я прывёў сябе ў парадак, часу было ўжо ўпрытык.

Экспрэс ад «Гранд Сэнтрал» даставіў мяне ў Нюарк прыкладна за пятнаццаць хвілін да завяршэння рэгістрацыі на рэйс.

Я праігнараваў электронныя тэрміналы і накіраваўся да ўсмешлівай дзяўчыны за стойкай «Аўстрыйскіх авіяліній». Яна бегла прагартала мой пашпарт, прасканавала яго, пацікавілася наяўнасцю багажу. Я пакруціў галавой. Мае сціплыя пажыткі цалкам змяшчаліся ў ручную паклажу, таму я стараўся ніколі не падарожнічаць з чамаданамі.

Мне вярнулі пашпарт з укладзеным у яго пасадачным талонам, суправаджаючы гэтую працэдуру інструкцыямі па выхадзе на пасадку і пажаданнем прыемнага палёту. Я падзякаваў дзяўчыне і адправіўся ў паказаным кірунку.

Яшчэ праз дваццаць хвілін, пасля праходжання працэдур мытнага кантролю, кішка тэлетрапа вывела мяне ў салон Боінга 767–300. Ён быў запоўнены практычна цалкам, таму выбраць месца на рэгістрацыі мне не прапаноўвалі. Пасадачны талон сцвярджаў, што маё крэсла размяшчалася ў

бакавым шэрагу ў праходзе. Улічваючы маю нелюбоў да віду з ілюмінатара, я быў задаволены гэтым фактам.

Перад тым, як закінуць сумку на багажную паліцу, я выняў адтуль планшэт, затым зняў пінжак, нядбайна запхнуў яго разам з сумкай наверх і сеў у крэсла. Хацелася піць, але я вырашыў дачакацца ўзлёту.

Суседняе ад мяне месца пуставала, нягледзячы на тое, што пасадка была ўжо скончана і іншых свабодных крэслаў я не бачыў.

У разліковы час узлёту самалёт усё яшчэ стаяў ля тэлетрапа. Сцюардэсы паведамілі, што вылет затрымліваецца. Я адкінуў галаву на падгалоўнік і закрыў вочы.

Прыкладна праз дзесяць хвілін прычына затрымкі стала зразумелая.

У салон бадзёрым крокам увайшоў мужчына гадоў сарака —мяркуючы па твары, араб — апрануты ў белую кашулю і светлыя штаны. Ён быў коратка стрыжаны, дзе–нідзе праглядвала сівізна, на твары было жорсткае, ідэальна выраўнаванае шчаціннe.

Расцягнуўшы вусны ў вінаватай усмешцы, ён выбачыўся перад сцюардэсай, тая, у сваю чаргу, таксама усміхаючыся яму, паказала, як прайсці да яго крэсла.

Як я ўжо згадваў, адзінае вольнае месца

знаходзілася каля ілюмінатара побач са мной, таму я практычна не сумняваўся, што наступныя дзевяць гадзін я правяду ў кампаніі з віноўнікам затрымкі нашага вылету.

Сапраўды, параўняўшыся са мной, мужчына спыніўся, кінуў позірк на пасадачны талон, затым на нумар месца, пасля чаго ўтрамбаваў невялікую дарожную сумку на багажную паліцу побач з маім партфелем.

Я падняўся ў праход, каб ён мог бесперашкодна сесці ў сваё крэсла, аднак мой спадарожнік чамусьці не спяшаўся скарыстацца маёй прапановай. З сумам паглядзеўшы на ілюмінатар, ён зноў расцягнуў на твары тую ж вінаватую ўсмешку, з якой заходзіў у самалёт, і звярнуўся да мяне.

— Я прашу прабачэння, магу я папрасіць вас памяняцца са мной месцамі? Разумееце, я вельмі баюся лятаць, і ад віду вышыні ў ілюмінатары мяне пачынае нудзіць. Не магу настойваць на сваёй просьбе, аднак буду вельмі ўдзячны вам, калі вас яна не абцяжарыць.

Спачатку я хацеў быў адказаць яму, што ў мяне тая ж праблема, аднак затым перадумаў. У рэшце рэшт, я бачыў людзей са значна больш цяжкай аэрафобіяй, чым у мяне

самога, і месца было для мяне не прынцыповым пытаннем. У вакно я мог цалкам сабе не глядзець. З усмешкай кіўнуўшы галавой, я сеў у далёкае крэсла, у той час як мой спадарожнік прызямліўся побач і ў тую ж хвіліну зашпіліў рамяні.

— Вялікі вам дзякуй, вы моцна мне дапамаглі.

— Не варта. Магу зразумець вашу праблему.

— На самой справе? У вас нешта падобнае? Можа быць, мне не трэба было вас прасіць аб гэтай паслузе?

— Усё добра. Я таксама крыху баюся лятаць, але для мяне няма вялікай розніцы, у якім крэсле пераносіць палёт.

Араб усім сваім выглядам выказваў шкадаванне.

— Яшчэ не позна памяняцца. Мне вельмі няёмка, што я прымусіў вас перасесці.

— Мы ўжо на рулёжцы. Не будзем нерваваць сцюардэс. Мне сапраўды не прынцыпова месца ў салоне, таму вы нікольні мяне не абцяжарылі.

— Што ж, у такім выпадку яшчэ раз дзякуй. Прабачце мне маю дапытлівасць, вы ляціце да Вены?

— Не, далей у мяне яшчэ адна перасадка, ужо дадому.

— У мяне таксама, — арабцяжка ўздыхнуў. — Чортавыя самалёты. Часам я зайздрошчу

людзям, якія яшчэ пяцьдзясят–шэсцьдзясят гадоў таму падарожнічалі ў Амерыку на караблях.

— На караблях гайданка, таксама не самае прыемнае выпрабаванне.

— Не магу судзіць аб гэтым, я не пакутую на марскую хваробу. У самалёце мяне ванітуе не ад гайданкі, а ад адчування, што да паверхні матухны–зямлі трыццаць тысяч футаў пустаты. Пачынаеш адчуваць уласную нікчэмнасць і бездапаможнасць. А я, ведаеце, не люблю адчуваць сябе нікчэмным — выдаткі тэмпераменту.

Я ўсміхнуўся.

— Але ж вам ніхто не забараняе і сёння перасоўвацца праз акіян па моры.

— Мой дарагі сябар, мы жывём у свеце, які не церпіць ні дня прамаруджвання. Морам можна плыць у Штаты ў сваё задавальненне, калі ты нікуды не спяшаешся. Страціць больш за тыдзень проста таму, што баішся лятаць, недаравальна для чалавека, якому трэба вырашаць неадкладныя пытанні.

Гаваркі араб пачынаў мне падабацца.

— Адкуль вы?

— Катар. Дазвольце прадставіцца, Тамім Гор.

Я пацiснуў працягнутую руку.

— Якуб Глінскі.

— Вы паляк? — Гор ажывіўся. — Мне шмат

даводзілася працаваць з палякамі.

— Вымушаны расчараваць. Я беларус. Мой дзед быў паляк, мяне назвалі ў ягогонар.

— Беларус? У вашай краіне, на жаль, бываць не даводзілася.

— Гэта звычайная гісторыя. Многія замежнікі ў падарожжах па Усходняй Еўропе не бываюць далей за Варшаву. А калі і бываюць, то накіроўваюцца наўпрост у Маскву. Гэта сумны факт для нас. Але мне прыемна, што вы хаця б не пытаецеся, у якой частцы Расіі знаходзіцца мясцовасць, адкуль я родам.

— Ну што вы. Я даволі нядрэнна арыентуюся ў мапе свету. Хоць падазраю, што ваша іронія заснавана на горкім вопыце.

— Мабыць, так.

Самалёт спыніўся на ўзлётнай паласе. Гор глыбока ўздыхнуў.

— Прашу мне прабачыць. Я вымушаны перарваць нашу размову. На ўзлёце мне заўжды становіцца млосна.

— Хацеў сказаць вам тое самае.

— Мяне суцяшае, што я знайшоў душу, якая мяне разумее. Яшчэ раз дзякуй вам за тое, што ласкава пагадзіліся выручыць мяне.

Гор адкінуўся на спінку крэсла і заплюшчыў вочы.

Рухавікі зараўлі, і мяне ўціснула ў сядзенне. Мімаходам я падумаў пра тое, якой

вар'яцкі магутнай павінна быць цяга, здольная адарваць шырокафюзеляжны самалёт ад зямлі і не даць яму абрынуцца ўніз. Потым думкі зніклі, я прымушаў сябе павольна і глыбока ўдыхаць, супакойваючы шалёны грукат сэрца.

Разбег, здавалася, доўжыўся цэлую вечнасць, а затым з'явілася тое самае ненавіснае мной пачуццё: яшчэ не бязважкасць, але ўжо адсутнасць чагосьці надзвычай неабходнага для камфортнага існавання. 767-ы цягнула ўверх быццам на нябачных тросах, гэтае напружанне я фізічна адчуваў кожнай клетачкай цела, і ўва мне не засталося нічога, акрамя жывёльнага страху перад магчымым абрывам гэтых тросаў ад нечалавечага нацяжэння.

Праз хвіліну я расплюшчыў вочы і паглядзеў у ілюмінатар.

Мы былі ўжо высока.

Гор усё яшчэ сядзеў з заплюшчанымі вачыма, учапіўшыся збялелымі пальцамі ў падлакотнік. Узлёт даваўся яму відавочна цяжэй, чым мне. Праз нейкі час ён нарэшце з асцярогай разляпіў павекі і агледзеўся па баках. Яго дыханне пакуль яшчэ не прыйшло ў норму, і ён баяўся адпусціць рукі.

— І гэта ж толькі пачатак, — прастагнаў ён. — Чортаў праграс, чортавая глабалізацыя, чортавае сціранне межаў! Лепш месяц

скакаць на кані, чым хвіліну правесці ў самалёце.

— Не перабольшвайце. Вы ствараеце ўражанне цывілізаванага чалавека. Няўжо ўсё настолькі дрэнна?

— А вы самі няўжо не замянілі б самалёт на нешта іншае, калі б у вас такая магчымасць?

Я засмяяўся.

— Што ж, можа быць. Вось толькі замест каня, мабыць, я аддаў бы перавагу аўтамабілю. Шкада, што Еўропу і Штаты не звязвае хайвэй.

Гор нарэшце адпусціў няшчасныя падлакотнікі.

— Калі раптам будзем падаць, будзьце ласкавыя, зламайце мне шыю адразу ж.

— Прабачце, не магу. Бо калі я зраблю гэта з вамі, хто акажа мне такую ж паслугу?

Араб агаліў белыя зубы.

— Адзін–адзін, Якуб. Вы дазволіце вас называць вас па імені?

— Калі ласка, Тамім.

— Вы былі ў Нью–Ёрку па нейкіх працоўных пытаннях?

— Хутчэй, па асабістых. А вы?

— Бізнэс, Якуб. Вялікія грошы патрабуюць вялікіх пакут, як бачыце.

— Вы гэта пра самалёты?

— Вядома.

— А якога роду бізнэс, калі не сакрэт?

— Толькі не смейцеся: я займаюся авіяперавозкамі і перапродажам самалётаў.

Не смяяцца я не мог. Гор ветліва ўсміхнуўся за кампанію.

— Прабачце мне... Гэта на самой справе даволі смешна — бачыць чалавека, які зарабляе на авіяцыі і пры гэтым да смерці баіцца лятаць.

— Разумею. Калі б я быў на вашым месцы, то таксама смяяўся б. Што зробіш, гэты бізнэс дастаўся мне ў спадчыну, і я не маю права яго прадаць. Да таго ж, ён прыносіць нядрэнныя прыбыткі.

— Што ж вы тады робіце ў салоне эканом–класа аўстрыйскіх авіяліній?

— Разумею ваш недавер. Аднак арабская марнатраўнасць не больш чым забабон. Мы ўмеем лічыць грошы не горш за іншых. Я мог бы перасоўвацца на асабістым самалёце, але лічу за лепшае накіроўваць сродкі ў тыя сферы, дзе яны насамрэч неабходныя. Для мяне не мае ніякага значэння, каму належыць самалёт, у якім мне страшна лятаць. Так навошта пераплочваць?

— Магчыма, вы і маеце рацыю. Хоць не магу сказаць, як бы я да гэтага ставіўся, калі б мог дазволіць сабе асабісты самалёт.

— Падазраю, што гэтак жа. Мне здаецца, што асабісты самалёт неабходны толькі нуварышам, якія яшчэ не паспелі найграцца

ў сваё багацце, або суперзоркам, якім хочацца спакою і адзіноты хоць бы ў небе. Калі ты проста заможны чалавек, якога, аднак, не пазнае на вуліцах кожны другі, то і патрэбы ў гэтым прадмеце раскошы няма ніякай. А чым вы зарабляеце на жыццё, Якуб?

— Збольшага пісанінай.

— То бок, вы пішаце кнігі?

— Не зусім. Я пішу планы, праграмы, праекты і іншую бязглуздзіцу. Сацыялагічныя і паліталагічныя даследаванні на службе дзяржаў і грамадскіх арганізацый.

— Вы працуеце самі на сябе?

— Па большай частцы, так.

— І хто ваш апошні кліент, калі не сакрэт?

— ААН і ўрад Бельгіі.

— Нядрэнна, трэба сказаць! Напэўна, вы добра зарабляеце?

— Гледзячы з чым параўноўваць, — я ўсміхнуўся. — У параўнанні з вамі я жабрак, але, тым не менш, мне хапае на жыццё. Скардзіцца было б несумленна.

— Што ж, гэта цалкам годны падыход. Вы, здаецца, казалі, што накіроўваецеся дадому?

— Так. Хачу адпачыць ад паездак і працы хоць бы месяц.

— Мне таксама хацелася б кінуць усё і адправіцца да сябе. Парадокс заключаецца ў тым, што ў мяне гэта атрымаецца толькі калі

мая справа пацерпіць крах.

— Як гэта?

— Разумееце, я лячу ў Вену, не ведаючы, куды адпраўлюся далей. Усё залежыць ад таго, ці змагу я пераканаць патрэбнага мне чалавека дапамагчы мне ў маёй працы. Калі я акажуся недастаткова пераканаўчым, мне давядзецца, так ці інакш, адправіцца ў Доху. Калі ж мне пашанцуе, хутчэй за ўсё, мяне чакае яшчэ адно падарожжа праз паўсвету.

— Чаго вы хочаце больш?

— Слова гонару, я стаміўся ад самалётаў да азвярэння. Але разумееце, ад размовы ў Вене залежыць не толькі поспех маёй справы, але і рэалізацыя вельмі важнага праекта, які мае значэнне не толькі для мяне.

— У такім выпадку, жадаю вам поспеху.

— Дзякуй. Я адлучуся на хвіліну.

Гор адшпіліў рамяні і падняўся.

Я адвярнуўся да ілюмінатара. Далёка ўнізе сінеў акіян. Мы яшчэ не ляглі на эшалон, аднак табло «Прышпіліць рамяні» ўжо згасла.

Гор падаўся мне цікавым чалавекам. Мая першапачатковая насцярожанасць у дачыненні да яго практычна цалкам знікла, саступіўшы месца зацікаўленасці. Хоць мне было камфортней падарожнічаць, не кантактуючы ні з кім, аднак я ўсё–ткі быў рады, што побач са мной апынуўся добры

суразмоўца, а не маўклівы надзьмуты балван.

Сцюардэсы разносілі напоі. Я папрасіў віна. Выканаўшы маю просьбу, сцюардэса павярнулася да Гора, які вяртаўся з прыбіральні.

— Чаго жадаеце?

— Будзьце ласкавыя, піва.

Араб злавіў мой здзіўлены погляд.

— Асуджаеце?

— Крый Божа. Не маю на тое ніякага права.

— Я мусульманін, але я ўсё-ткі прагрэсіўны і цывілізаваны чалавек, як вы заўважылі, Якуб. Хрысціяне таксама далёка не заўсёды строга прытрымліваюцца Бібліі, і гэта не замінае ім лічыць сябе добрапрыстойнымі паслядоўнікамі Хрыста. Я не злоўжываю алкаголем, аднак магу зрэдку яго сабе дазволіць. Напрыклад, для зняцця стрэсу, як цяпер.

— Нічога не маю супраць, Тамім. Наадварот рады, што вы не закасцянелі ў рэлігійных догмах, як многія іншыя.

— Усё павінна быць у меру, я лічу. І ўзровень рэлігійнасці, і адступленні ад яе. Тады чалавек становіцца збалансаваным і гатовым да жыцця ва ўсіх яго праявах.

Я падняў бакал.

— Ваша здароў'е, Тамім.

— Ваша, Якуб.

Самалёт выраўняўся. Мы выйшлі на эшалон. Наступныя сем з паловай гадзін пры нармальным збегу абставін павінны былі прайсці без усялякіх змен.

— Дык значыць вы, Якуб, працуеце, па большай частцы, з буйнымі гульцамі на рынку. А вам даводзілася выконваць працу для камерцыйных арганізацый?

— Даследаванні рынку і ўсё ў гэтым духу? Не, гэта не мой профіль. А вы хочаце прапанаваць мне працу?

Гор шлынуў піва і ўсміхнуўся.

— Не, мой бізнэс не мае патрэбы ў даследаванні рынка. У мяне ёсць кліенцкая база, пад патрэбы якой я працую, і ніякага жадання пашырацца ў мяне няма.

— Дзіўныя словы для бізнэсмена. Як правіла, усе хочуць маштабаваць сваю справу.

— Толькі не я. Ведаеце, я кантралюю невялікі сегмент рынку, які дазваляе мне не бедаваць. Сам бізнэс даўно надакучыў, дакладней надакучыла матывацыя. Грошай мне хапала заўсёды, а вось бізнэс дзеля бізнэсу мяне ніколі не вабіў. Вось чаго сапраўды хацелася б — дык гэта паменшыць уласны галаўны боль, які ўзнікае па прычыне залішняй занятасці. Як я ўжо казаў, прадаць справу я не магу (такія ўмовы тэстаменту), але ў ім нічога не сказана пра

тое, што я павінен гэтую самую справу развіваць да нейкіх сапраўды сур'ёзных маштабаў.

— Вы хочаце шчаслівай бяздзейнасці?

— Не зусім. Я хачу рабіць штосьці, што мне падабаецца. У апошні час я атрымліваю задавальненне ад дабрачыннасці. Што вы думаеце пра гэтую з'яву?

— Гледзячы што вы маеце на ўвазе. Адзін мудры чалавек сказаў аднойчы, што дабрачыннасць — гэта калі ты з жонкай не пасварыўся з раніцы, і ведаеце, Тамім, у яго словах нешта ёсць. Так пра якую дабрачыннасць вы кажаце?

— Мы дапамагаем дзецям, Якуб. Тым, хто мае патрэбу ў тэрміновым лячэнні, тым, хто пацярпеў ад баявых дзеянняў, тым, хто страціў бацькоў і апекуноў.

— У Катары ёсць такая праблема?

— Хіба я згадаў дзесьці Катар? Мы прымаем дзяцей з усяго свету, аказваем ім медычную і рэабілітацыйную дапамогу цалкам бясплатна, лечым іх, вучым, дапамагаем адысці ад мінулага жыцця і навучыцца самім клапаціцца пра сябе. Гэта пачаў рабіць яшчэ мой бацька, пры ім быў заснаваны рэабілітацыйны цэнтр у Доху, якім я зараз фармальна кірую.

— Чаму фармальна?

— Таму што я не спецыяліст. Я выконваю

выключна адміністрацыйную і апякунскую функцыі. Пэўны адсотак ад прыбытку майго бізнэсу я пералічваю на развіццё гэтага цэнтра. У планах адкрыць міжнародную школу для дзяцей, якія страцілі бацькоў праз войны. Мая мара — зрабіць так, каб дзеці, якія будуць там вучыцца, выраслі сапраўднымі грамадзянамі свету, пазбаўленымі забабонаў і страхаў, якія навязваюць звычайным дзецям іх асяроддзе і сваякі, што ніколі не бачылі рэальнага жыцця.

— Антыглабалісты вас задзяўбуць.

— А ім зусім неабавязкова ведаць пра гэта. На жаль, нашы магчымасці шырокія, але не бязмежныя. У свеце жывуць тысячы і тысячы дзяцей, якім мы хацелі б дапамагчы, але не маем магчымасці. Нават самыя багатыя кампаніі ў свеце не ў стане вылечыць усіх і даць ім адукацыю. Мы не афішуем сваю дзейнасць, таму што ў адваротным выпадку нам давялося б шмат адмаўляць тым, каму мы не можам дапамагчы, а гэта занадта жорстка: працягнуць руку адным і не прыняць іншых.

— Тады па якім прынцыпе вы выбіраеце тых, каму будзеце аказваць дапамогу?

— У нашым штаце ёсць некалькі супрацоўнікаў, якія займаюцца пастаянным маніторынгам дабрачынных фондаў і

навінных стужак па ўсім свеце. Мы старанна правяраем усіх, хто, на нашу думку, сапраўды мае патрэбу ў нашай дапамозе, вывучаем іх гісторыі, ацэньваем нашы магчымасці ў адпаведнасці з іх патрэбамі. Амаль палова з усіх першапачаткова запоўненых электронных картак адсейваецца — гэта тыя, хто можа пачакаць, каму здольныя аказаць дапамогу і аказваюць яе іншыя, або тыя, каму дапамагаць ўжо занадта позна. Досыць вялікі працэнт складаюць фіктыўныя гісторыі — прыдуманыя ашуканцамі, часцяком настолькі ўмела і з выкарыстаннем настолькі якасных падробленых дакументаў, што нават сур'ёзныя дабрачынныя арганізацыі не заўважаюць падвоху. Мы ўмеем вылічаць такіх і перадаём інфармацыю сілавым структурам, у чыёй юрысдыкцыі знаходзяцца злодзеі. Аднак, нягледзячы на нашы намаганні, гэта цэлы нелегальны рынак, які зарабляе на даверлівасці людзей з вялікім сэрцам. Фінальнай стадыяй нашай праверкі, дарэчы, з'яўляецца вочная стаўка з тымі, хто будзе з'яўляцца канчатковым атрымальнікам нашай дапамогі — з дзецьмі, якія маюць патрэбу ў дапамозе. Гэтыя самыя супрацоўнікі, якія працуюць у нас, знаходзяцца ў пастаянным руху па ўсім

свеце, і паведамленне з нашай прапановай аб дапамозе не атрымлівае ніхто без такой вочнай стаўкі. Хоць часам бывае неверагодна цяжка знайсці тых, хто нам патрэбны, бо ў большасці сваёй мы працуем у самых бедных краінах свету, там, дзе ў самым разгары альбо толькі што скончыліся баявыя дзеянні.

— Якой колькасці людзей вы можаце дапамагчы ў год?

— Гэта вельмі невялікія лічбы, Якуб: парадку трыццаці чалавек. Пры гэтым трэба разумець, што мы не можам вылечыць дзіця або паставіць яму пратэзы і выкінуць яго назад у той кашмар, з якога мы забралі яго. Даводзіцца шукаць для такіх дзяцей новы дом і новую будучыню. Пошукі часам займаюць працяглы тэрмін і адбіраюць шмат дадатковых сродкаў. І нават калі яны заканчваюцца поспехам, далёка не ўсе пакідаюць сцены нашага рэабілітацыйнага цэнтра ўсяго праз год. Таму рэальная лічба тых, хто штогод атрымлівае шчаслівы білет, на жаль, яшчэ меншая.

— Але ж тых, хто мае патрэбу не трыццаць, а значна больш. Як вы выбіраеце?

— Сляпы выпадак. Кампутарная праграма рандомнага выбару. Калі ўсё толькі пачыналася, адбор рабіўся кіраўніком фонда ўручную. Мой бацька ўсляпую даставаў з мяшка картку з напісаным на ёй імем

дзіцяці. Я змяніў гэтую сістэму, таму што я не магу выконваць функцыі Усявышняга, гэта вельмі вялікі маральны цяжар. Цяпер кожнаму кандыдату мы прысвойваем шыфр, і кампутар выпадкова вызначае патрэбную нам колькасць шыфраў. Я нават скінуў з сябе абавязак націскаць на кнопку запуску праграмы — зараз гэта робіць адзін з нашых супрацоўнікаў.

— Колькі гадоў ваша арганізацыя ўжо займаецца гэтым?

— З тысяча дзевяцьсот васьмідзясятага года. Ужо трыццаць шэсць гадоў. З іх шаснаццаць ёй кірую я — пасля смерці бацькі.

Колькім дзецям вы дапамаглі?

— Сямісот дваццаці чатыром. Гэта калі не лічыць тых, хто цяпер знаходзіцца пад нашай апекай. У нас былі дзеці з усяго зямнога шара. І ўладкоўваем іх мы таксама па ўсім свеце. Большасць з іх ужо дарослыя і цалкам самастойныя людзі. Самым першым дзецям, прынятым на лячэнне ў Доху, ўжо больш гадоў, чым мне самому, бо бацька заснаваў гэты цэнтр, калі мне было чатыры гады.

— Ваш бацька, мяркуючы па ўсім, быў вялікі чалавек, Тамім.

— Зусім не — калі, вядома, не блытаць веліч з нормай. Ён быў тым, да чаго павінен

імкнуцца кожны: чалавекам, які дабіўся поспеху сам і які накіраваў поспех у добрую справу. Тут няма подзвігу і няма велічы, ёсць толькі нармальная мадэль паводзінаў любога чалавека, які любіць жыццё — сваё і чужое, незалежна ад веравызнання. Я імкнуся да таго ж, хоць мушу прызнаць, што часам маіх намаганняў і маёй матывацыі недастаткова.

— Але тады чаму вы не хочаце маштабаваць бізнэс хаця б дзеля таго, каб перанакіроўваць больш грошай на развіццё вашага цэнтра?

— Вы думаеце абсалютна правільна, Якуб. Дабрачыннасць павінна быць разумнай, і мала карысці ад чалавека, які ахвяраваў усё сваё жыццё выключна служэнню астатнім. Чалавек, у якога нічога няма, няшмат можа даць тым, хто жыве ў нястачы. Значна больш разумная мадэль — дамагчыся поспеху самому і ахвяраваць непараўнальна больш. Так рабіў мой бацька. Верагодна, аднойчы я прыйду да таго, каб прызначыць кіраўніка для маёй кампаніі, які зможа зрабіць больш чым я. У мяне няма ўласнага самалёта, я прадаў яго на карысць цэнтра, ёсць толькі самалёт, які належыць кампаніі, яго я пазбавіцца не магу, хоць бы таму што неабходнасць у ім для справы мне відавочная. Аднак з продажам самалёта ў

мяне атрымалася перадаць больш за дваццаць мільёнаў на добрую справу — гэта звыш таго, што я штогод пералічваю ад даходаў майго бізнесу. Магчыма, гадоў праз дзесяць я вырашу цалкам пакінуць сямейную справу і тады зраблю менавіта так: застануся ўладальнікам, але перадам кіраванне камусьці больш кампетэнтнаму. Аднак цяпер ёсць яшчэ адзін праект, над якім я працую, і гэта не дазваляе мне пераключыцца цалкам.

— Вы аперыруеце вельмі маштабнымі ідэямі і сумамі, Тамім. Верагодна, ваш новы праект з той жа серыі? Гэта таямніца, у чым ён заключаецца?

Гор пацiснуў плячыма.

— Пакуль што я звязаны пэўнымі абавязацельствамі і не магу раскрываць падрабязнасцей. Аднак гэтая справа значна маштабней чым усё, пра што я вам расказаў, і, спадзяюся, яна прынясе яшчэ больш карысці.

— Дзеля яе вы ляціце ў Вену?

— Па большай частцы, так. Як я ўжо казаў, мне трэба заручыцца падтрымкай аднаго чалавека для паспяховай рэалізацыі праекта. Гэта вельмі мудры чалавек, але пераканаць яго будзе нялёгка, тым больш, што ў мяне будзе вельмі мала часу, каб зрабіць гэта. Аднак я павінен хаця б

пастарацца.

— Мне знаёмае гэтае пачуццё — калі ад цябе мала што залежыць, але прыкладаць намаганні ўсё адно трэба, проста таму што інакш нельга. Не далей чым учора я адчуваў яго.

— У вас не атрымалася?

— На жаль, не.

— Але вы ўсё роўна не здаяцеся?

— Цяжка не здавацца, калі не бачыш іншых шляхоў. Аднак я спадзяюся, што гэта яшчэ не канец. Назавём гэта адступленнем для перагрупоўкі.

— Ды вы стратэг, Якуб! Мой бацька казаў, што настойлівасць — гэта рыса не толькі смелых, але і ўдачлівых. Я ўпэўнены, што вам пашанцуе.

— Дзякуй.

— З вашага дазволу, я паспрабую паспаць. Хто ведае, калі ў наступны раз у мяне атрымаецца заснуць, трэба выкарыстоўваць любую магчымасць.

— Я вам зайздрошчу. Хоць, здаецца, я не так моцна баюся лятаць як вы, Тамім, аднак спаць у паветры я катэгарычна не магу.

— Гэта ўсяго толькі ўменне кантраляваць свой арганізм. Для гэтага патрэбны воля, доўгія трэніроўкі і веданне некалькіх простых прыёмаў. Прымусіць сябе адключыцца можна ў любых умовах, нават

пад абстрэлам. Я хачу папрасіць вас: калі прынясуць вячэру, скажыце, каб не будзілі мяне. Без ежы я магу жыць значна даўжэй, чым без сну.

— Дамовіліся.

Гор апусціў спінку крэсла, выцягнуў ногі і заплюшчыў вочы. Праз хвіліну ён ужо сапраўды спаў. Я падумаў пра тое, што трэба будзе папрасіць яго перад пасадкай раскрыць свой сакрэт і, пры магчымасці, патрэніравацца самому. Падобнае ўменне, відавочна, не зашкодзіла бі мне.

Наступныя гадзіны прайшлі ў кампаніі мультымедыйнай сістэмы 767-га. Гор спаў неверагодна моцна, і нават невялікая трасяніна на пятай гадзіне палёту не разбудзіла яго, ён толькі нячутна прамармытаў нешта і павярнуў галаву на іншы бок. Улічваючы, што мяне турбулентнасць здольная была нават падняць з мёртвых, на хвіліну я засумняваўся, ці не разыграў ён спектакль пра сваю боязь палётаў.

А восьмай раніцы па часе Вены запалілася табло «прышпіліць рамяні». Мы заходзілі на пасадку.

Гор расплюшчыў вочы і развёў рукамі, размінаючы мышцы.

— Як прайшоў палёт?

— Як бачыце, мы ўсё яшчэ жывыя, Тамім, —

значыць усё добра.

— Так, сапраўды. Як кажуць пілоты, удалай пасадкай лічыцца тая, з якой ты можаш сысці сваімі нагамі… Зрэшты, мы яшчэ не селі, так што расслабляцца рана.

— А вы, я гляджу, аптыміст. Як спалася?

— Выдатна. Я нават адчуваю сябе бадзёрым, а гэтага эфекту вельмі цяжка дасягнуць у крэсле самалёта. А вы так і не паспалі?

— Ніколі не спаў у самалёце. Не магу. Падзяліцеся сваім метадам, раптам мне спатрэбіцца.

— Я магу параіць вам пэўную літаратуру, якая вам дапаможа. А ў цэлым, усё досыць проста. Трэба ўмець правільна дыхаць і цалкам адключаць свае думкі, не пакідаючы ў свядомасці нічога, акрамя пустэчы.

— Гэта як?

— У кожнага свае спосабы. Мне асабіста дапамагае прадстаўляць, што я кірую сваёй свядомасцю, як пілот кіруе самалётам: я магу шчоўкнуць спецыяльным тумблерам, і запальванне выключыцца. Адзін шчаўчок — і свет вакол знікае. Але гэтаму трэба вучыцца і трэніраваць свае здольнасці. Перад сном паспрабуйце цалкам супакоіць і розум, і цела, глыбока дыхайце, думайце пра што–небудзь прыемнае і ненавязлівае. Разважайце пра тое,

што вы хацелі б убачыць у сне. А потым, калі падрыхтуеце сябе, уявіце гэты самы тумблер і зрабіце з ім тое, што павінны зрабіць. Адразу, хачу папярэдзіць: ні з першага разу, ні з другога ў вас, хутчэй за ўсё, не атрымаецца. Так трэба рабіць кожны раз перад сном на працягу месяца, двух або больш — у кожнага па–свойму. Аднак рана ці позна гэта ўвойдзе ў звычку, і, каб спакойна заснуць, вам не давядзецца нават рыхтаваць сябе да гэтага — будзе дастаткова шчоўкнуць тумблерам. У вас ёсць візітоўка? Я адправіў бы вам штосьці пачытаць па гэтай тэме.

Я дастаў з кішэні візітоўніцу і ўручыў Гору картку.

— Ці магу я, у сваю чаргу, атрымаць вашу візітоўку?

Араб відавочна збянтэжыўся.

— Прабачце, Якуб, я раздаў у Нью–Ёрку ўсе свае запасы. Але, калі хочаце, я дашлю свае каардынаты ў лісце са спасылкамі.

— Буду ўдзячны.

Па салоне ў апошні раз прайшлі сцюардэсы, правяраючы зашпіленыя рамяні, узнятыя столікі і шторкі ілюмінатараў. Неўзабаве яны таксама занялі свае месцы і прышпіліліся. Да пасадкі заставалася некалькі хвілін.

Я з цікавасцю глядзеў у ілюмінатар.

Я шмат разоў бываў у Вене.

Мне не вельмі падабаўся гэты горад. Я не любіў пампезную архітэктуру імперскіх гарадоў. Гэта тычылася не толькі Вены, але і Лондана, Масквы, Санкт–Пецярбурга і падобных ім. Куды больш мне былі па душы маленькія сярэднявечныя гарады Еўропы або каланіяльная забудова Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. Мала хто згаджаўся з маім меркаваннем, але я і не настойваў.

Сёння, зрэшты, мне не трэба было ацэньваць прыгажосць горада. Я не збіраўся пакідаць межы аэрапорта.

Як і на ўзлёце, Гор закрыў вочы і ўчапіўся рукамі ў падлакотнікі. Я ж наадварот адчуваў сябе цалкам нядрэнна і назіраў за тым, як імкліва набліжаецца зямля. Спераду вынырнуў бетон пасадачнай паласы, і праз пару секунд прагучаў удар, які абвяшчаў пра дотык шасі. Зароў рэверс рухавікоў, як быццам салон на некаторы час апынуўся ў самым эпіцэнтры буры, а затым усё сціхла.

Мы каціліся па рулёжцы ў напрамку тэрміналаў з тэлетрапамі. Гор асцярожна расплюшчыў вочы.

— Усё?

— Усё, — засмяяўся я. — Цяпер вы сапраўды зможаце сысці сваімі нагамі, так што пасадка для вас лічыцца ўдалай.

— Нарэшце гэта ўсё скончылася. Шкада

толькі, што зусім хутка зноў трэба лезці ў кансервавую банку.

— Мне таксама. Але мяне радуе, што мой наступны палёт будзе доўжыцца менш за дзве гадзіны. Вам, мяркуючы па ўсім, прыйдзецца горш.

— Хто ведае, — задуменна працягнуў Гор.

— Што вы маеце на ўвазе?

— Не, прабачце, гэта ўсяго толькі думкі ўслых.

Самалёт мякка спыніўся, пасля чаго да яго прыстыкавалася кішка тэлетрапа.

— Мяркуючы па ўсім, нам пара развітвацца, Тамім. Мне ў транзітную залу, вам — на сваю сустрэчу. Я шчыра рады знаёмству з вамі. На жаль, не кожны палёт праходзіць з такім цікавым спадарожнікам. Буду чакаць ад вас паведамлення.

— Не спяшайцеся пакуль развітвацца, Якуб. Мне таксама трэба ў транзітную залу, як і вам.

— Як жа так? А ваша сустрэча?

— Яна і павінна там адбыцца. Справа ў тым, што чалавек, які мне патрэбны, як і вы, у Вене толькі праездам. Таму я і казаў, што ў мяне вельмі мала часу, каб пагаварыць з ім і пераканаць у грунтоўнасці маіх довадаў.

— Мабыць, транзітная зала міжнароднага аэрапорта — гэта адно з самых незвычайных месцаў для запланаванай дзелавой сустрэчы.

— Умоўнасці і выдаткі глабалізацыі, мой дарагі. Сустрэчы прызначаюцца там, дзе гэта магчыма для абодвух суразмоўцаў, і тады, калі ў абодвух ёсць некалькі вольных хвілін. Часам гэта сапраўды даволі незвычайныя месцы і незвычайны час.

— Іншымі словамі, вы праляцелі паўсвету дзеля кароткай размовы ў аэрапорце?

Гор ўхмыльнуўся.

— Магчыма, яно таго вартае. А можа быць і не, але так нават яшчэ цікавей. Давайце будзем выходзіць.

Мы падняліся ў праход, забралі сваю ручную паклажу і рушылі да выхаду. Развітваючыся са сцюардэсай, Гор па–ўсходняму прыклаў руку да грудзей і нахіліў галаву.

У транзітнай зоне я спыніўся перад табло вылету, вывучаючы расклад.

— Колькі ў вас часу? — спытаў Гор.

— Крыху менш за чатыры гадзіны. А ў вас?

— Пакуль не ведаю. Я ж казаў, што мой далейшы кірунак залежыць ад выніку перамоў.

— Але ж у вас павінны быць квіткі на наступны рэйс, інакш вы б не патрапілі ў транзітную залу.

— У мяне на ўсялякі выпадак ёсць квіткі для абодвух кірункаў. Адзін з іх я магу ануляваць, атрымаўшы кампенсацыю.

— А калі вы павінны сустрэцца са сваім суразмоўцам?

— О, досыць хутка. Але пакуль што ў мяне ёсць яшчэ нейкі час. Не хочаце прагуляцца па д'юці–фры?

— Не, дзякуй, я даўно астыў да гэтай забаўкі.

— У такім выпадку, прапаную вам знайсці свабодныя крэслы і прысесці.

— Можа быць, вы хочаце перакусіць? Вы ж у палёце вы нічога не елі.

— Не, дзякуй, я не галодны. Хоць, магчыма, вы хацелі б падсілкавацца? Не? Тады давайце уладкуемся проста тут, — Гор кінуў невялікую сумку побач са свабодным сядзеннем.

Я паклаў свой багаж побач, выцягнуўшы папярэдне планшэт, і мы селі.

— Я праверу пошту. Не люблю доўга пакідаць лісты без адказу.

— Калі ласка, Якуб. Я схаджу вазьму кавы. Не жадаеце?

— Так, калі можна. Вазьміце мне двайны эспрэса.

Тамім кіўнуў і пайшоў. Я падключыў планшэт да сеткі аэрапорта і залез у паштовую скрыню. Сярод спаму не было нічога важнага, толькі ў канцы спісу свежых ўваходных вісеў ліст з паштовай скрыні маёй дачкі.

«Прывітанне, тата! Я сумую. Калі ты вернешся?»

Ліст быў амаль без памылак. Мая малайчынка вучылася хутка.

«Я сёння ж прыеду да цябе, сонейка. Таксама вельмі моцна сумую. Мы цэлы месяц будзем разам. Чакай сёння званка ад мяне. Цалую, тата».

Затым я заўважыў, што да ліста быў прымацаваны файл. Гэта быў фотаздымак. На ім мая дзяўчынка ўсміхалася і махала мне ручкай.

— Гэта ваша дачка? — прагучала за маёй спінай.

Я павярнуўся. Гор стаяў з двума кубачкамі кавы ў руках.

— Калі ласка, прабачце. Я паступіў дрэнна. Я мімаходам убачыў фотаздымак у вас на экране і не ўтрымаўся ад пытання.

— Усё добра, Тамім. Так, гэта мая дзяўчынка.

— Сімпатычная. Колькі ёй?

— Пяць гадоў. Яна ўжо зусім дарослая.

— Сама піша вам лісты?

— Як бачыце.

— Малайчынка. У мяне сын. Ён старэйшы: яму дванаццаць. Завальвае мяне паведамленнямі ў WhatsApp. Вось ваша кава.

— Дзякуй. Колькі я вам вінен?

— Супакойцеся, Якуб. Я зараз таксама вам

пакажу фатаграфію свайго сына, калі вы не супраць.

Гор паставіў кубачак на сядзенне і адкрыў сумку. Мяркуючы па ўсім, планшэт ляжаў у самым нізе, таму арабу давялося выцягнуць некалькі празрыстых папак з паперамі, перш чым ён дакапаўся да шуканага прадмета. Папкі ён паклаў побач з кавай, на самы край. Выкладаючы планшэт, ён зачапіў іх рукой, і яны ўпалі на падлогу. Частка папер разляцелася.

Гор вылаяўся скрозь зубы.

— Я дапамагу вам, — я нагнуўся за паваленымі дакументамі.

У наступную секунду я павольна споўз на падлогу, не ў сілах паверыць сваім вачам.

Я трымаў у руках старонку свайго ўласнага праекта, копію якога пакінуў учора ў кабінеце намесніка Генеральнага Сакратара ААН Эдмона Гаспара Эша.

Гор сядзеў над россыпам папер і ўсміхаўся.

— Па праўдзе сказаць, я хацеў абысціся без гэтай залішняй тэатральнасці, але нічога лепш не прыдумаў.

— Якога д’ябла?! Адкуль у вас гэта? Па якім праве вы займелі гэтыя дакументы? Вы выкралі іх з Сакратарыята?

— Прашу вас, Якуб, не так гучна, інакш намі зацікавіцца служба бяспекі аэрапорта, а гэта не патрэбна ні мне, ні вам.

— Я якраз не адмоўлюся, каб вамі зацікавіліся адпаведныя службы. Вы злодзей, які скраў маю ўласнасць!

— Супакойцеся, Якуб, я нічога не краў. Сядзьце назад, і мы з вамі спакойна пагаворым.

Марна спрабуючы трымаць сябе ў руках, я вярнуўся на крэсла.

— Што ж, я вас слухаю. Мне вельмі цікава, хто вы такі на самой справе, як да вас патрапілі гэтыя паперы і што вам ад мяне трэба.

Гор выцягнуў тэлефон.

— Для пачатку я хачу даказаць вам, што не краў гэтыя дакументы. Я пры вас патэлефаную доктару Эшу, і вы самі з ім пагаворыце.

Ён набраў нумар і працягнуў мне трубку.

На тым канцы лініі адгукнуліся практычна імгненна.

— Добры дзень, доктар Глінскі. Спектакль ужо адбыўся?

Голас без сумневу належаў намесніку Генеральнага сакратара.

— Добры дзень, доктар Эш. Можа быць, вы растлумачыце мне, што ўсё гэта значыць?

— Лепш за мяне вам усё растлумачыць палкоўнік Гор. Мая місія заключаецца ў тым, каб пацвердзіць вам факт перадачы вашых дакументаў ад мяне да яго. Ён нічога не

скраў, аднак, прадбачачы тое, што вы падумаеце менавіта так, мы запланавалі гэтую размову.

— Палкоўнік? Які, да чорта, палкоўнік?

— Не кіпяціцеся, калі ласка. Лепш пагаварыце з ім. Са свайго боку я прашу прабачэння за тое, што перадаў без вашага ведама праект трэцім асобам. Аднак я хачу запэўніць вас, што я зрабіў так з лепшых памкненняў, і вы можаце безумоўна давяраць гэтаму чалавеку. Я ведаю ягодаўно, і ніколі ў мяне не ўзнікала прычын сумнявацца ў ім.

— Цяпер я ўжо не бачу падстаў давяраць нават вам, доктар Эш.

— Гэта ваша права. Тым не менш, я думаю, вам будзе карысна выслухаць Гора. Затым вы будзеце самі прымаць рашэнне, ці верыць яму і мне. Я прашу мне прабачыць, я вымушаны ісці і не магу гаварыць больш. Аднак, калі вы захочаце пасля звязацца са мной, мой асабісты нумар тэлефона вам у любы момант прадаставіць Тамім. Усяго добрага, Якуб. І не прымайце паспешных рашэнняў.

У слухаўцы загучалі кароткія гудкі.

Я цяжка глядзеў на чалавека, які, прадставіўшыся мне бізнэсменам і мецэнатам, апынуўся кімсьці зусім іншым, з няяснымі для мяне мэтамі і намерамі.

— Значыць палкоўнік, так?

— На жаль, не мільянер, усяго толькі палкоўнік, хоць і ў адстаўцы. Я не з'яўляюся дзеючым ваеннаслужачым, але маім старым знаёмым зручна зваць мяне менавіта так.

— Добра. Я вас слухаю. У вас ёсць дваццаць хвілін, каб пераканаць мяне ў тым, што я павінен даверыцца вам.

— Я паспрабую ўкласціся ў адведзены мне час. А далей вы самі вырашыце, ці варта працягваць размову. Хоць мне здаецца, тэма вас зацікавіць.

Мяне сапраўды завуць Тамім Гор. Я родам з Катара. Доўгі час быў на службе ва ўзброеных сілах гэтай краіны. Па абавязку службы мне даводзілася выконваць самыя розныя даручэнні, у тым ліку першых асоб маёй краіны. Адзін час я адказваў за ахову эміра і, па вялікім рахунку, быў яго спецпасланнікам. Зараз я служу не дзяржаве, а канкрэтнаму чалавеку, імя якога я пакуль не магу агучыць, ды яно і наўрад ці пра што–небудзь вам скажа. Гэта вельмі багаты чалавек, і часткова легенду, якую я распавёў вам падчас палёту, я запазычыў з яго ўласнай біяграфіі. За адным толькі выключэннем: я, мякка кажучы, прыменшыў памеры багацця гэтага чалавека і сферы яго інтарэсаў.

Два месяцы таму яму патэлефанаваў доктар Эш і расказаў пра вашу праграму,

якую вы даслалі яму для ацэнкі. Мой начальнік (ці гаспадар — як заўгодна) вельмі зацікавіўся вашым праектам. Эш адразу сказаў, што па цэлым шэрагу прычын яго магчымасцей недастаткова нават для таго, каб ініцыяваць разгляд вашых дакументаў, тое ж самае ён, наколькі я ведаю, паўтарыў і вам ўчора. Але ён ведаў, як дапамагчы вам іншым спосабам. У свеце ёсць людзі, для якіх дзяржаўныя інстытуты і нават наднацыянальныя арганізацыі значаць няшмат, а магчымасці ў такіх людзей практычна бязмежныя. Хтосьці выкарыстоўвае гэтыя магчымасці дзеля ўласнага ўзбагачэння, нехта — для патурання ўласнаму славалюбству, хтосьці — на карысць сваім палітычным амбіцыям. Аднак ёсць і такія, каму ўсё вышэйпералічанае мала цікава. Ім цікавыя маштабныя і нават ўтапічныя праекты. Мой гаспадар з такіх. Ён — адзін з нямногіх людзей на зямлі, калі не адзіны, хто мае магчымасці і жаданне дапамагчы вам даць хаця б старт той справе, якую вы прапанавалі Эшу.

У нас ёсць пэўная інфраструктура і рэсурсы, якія мы можам перадаць для развіцця праекта. Мне было даручана сустрэцца з вамі, каб асабіста ацаніць ступень сур’ёзнасці вашых намераў. Нам важна

ведаць, наколькі далёка вы гатовыя зайсці. Для нас гэта таксама свайго роду гульня ва-банк. Учора, пасля вашага сыходу з Сакратарыята, я пабываў у Эша і падрабязна абмеркаваў з ім план дзеянняў. Ад яго ж я і атрымаў копію дакумента. Мы прынялі рашэнне даць вам час падумаць аб вашых далейшых кроках і зразумець, што іншых варыянтаў у вас няма. А пакуль што я павінен быў пазнаёміцца з вамі, увайсці да вас у давер. Значна менш шанцаў у мяне было б, калі б я падышоў да вас і расказаў пра ўсё ў лоб. Баюся, вы не сталі б нават слухаць мяне.

Я павінен зрабіць вам канкрэтную прапанову. У вас ёсць два варыянты: пагадзіцца з ёй ці забыць і пра мае словы, і пра мяне, і пра гэтую сустрэчу, назаўжды развітаўшыся са сваёй марай. Я разумею, што вы таксама рызыкуеце ўсім і не абавязаны верыць мне, аднак іншага шанцу, на жаль, у вас не будзе. Вы гатовыя выслухаць гэтую прапанову?

— А ў мяне ёсць выбар?

— Выбар ёсць заўсёды, Якуб. Аднак, я мяркую, што гэта быў станоўчы адказ. Вось прапанова, якую я павінен вам перадаць. Мой гаспадар цалкам згаджаецца з усімі пунктамі, выкладзенымі ў вашай праграме, згаджаецца з яе мэтамі і задачамі. Ён абавязваецца не выкарыстоўваць вашу працу

ў сваіх карыслівых мэтах і запэўнівае вас у выключна гуманістычных пазіцыях, на якіх ён аказвае вам падтрымку. Ён перадае вам ва ўпраўленне адасобленую тэрыторыю для пачатку працы над вашай праграмай, інфраструктуру, пабудаваную на яго сродкі; абавязваецца ўкласці сур'ёзныя сродкі ў вашу ідэю з тым, каб даць ёй годны старт. Гэтых сродкаў вам хопіць як мінімум на некалькі гадоў працы.

— А што ўзамен?

— Нічога. Аднак вам давядзецца пагадзіцца з некаторымі зменамі ў праграме, неабходнымі не з–за капрызу майго гаспадара, а з саміх рэалій, у якіх вам давядзецца працаваць. Акрамя таго, вы павінны дазволіць яму апасродкавана ўдзельнічаць у кіраўніцтве вашай праграмай. У яго не будзе ніякага права «вета», вы толькі даяце згоду ўлічваць яго меркаванне і яго пажаданні настолькі, наколькі самі палічыце патрэбным. Гэта ўсё.

— І вы хочаце, каб я пагадзіўся проста тут, у гэтую самую секунду, не ведаючы пакуль нічога, не маючы ніякіх гарантый, не бачачы твару чалавека, які робіць мне гэтую прапанову?

— Што да апошняга — такія яго ўмовы. Ён хоча застацца невядомым нават вузкаму колу людзей, якія будуць працаваць у

праекце. Па–першае, ён досыць замкнёны, а па–другое, як я ўжо сказаў, ён кіруецца выключна прынцыпамі гуманнасці, філантропіі і цягі да прагрэсу. Яму не патрэбныя падзякі. Людзі, якія дасягнулі ў жыцці значна большага, чым простыя смяротныя, як мы з вамі, аперыруюць іншымі катэгорыямі каштоўнасцей. Што тычыцца доказаў, я сапраўды не магу даць іх вам у гэтую секунду. У мяне проста іх няма. Аднак я змагу прадэманстраваць іх вам вельмі хутка.

— Калі ж?

— Прыкладна праз дваццаць гадзін — калі вы пагадзіцеся азнаёміцца з імі.

— Патлумачце.

— Я хачу паказаць вам тую самую тэрыторыю, якую мы гатовыя вам перадаць, тыя магчымасці, якія будуць у вашым распараджэнні. Хачу, каб вы ўбачылі ўсё на свае вочы. І толькі тады вы прымеце сваё рашэнне. Вы маеце права адмовіцца зараз і адправіцца дадому, але вы павінны ведаць, што мы больш ніколі не вернемся да гэтай размовы. Альбо вы згаджаецеся проста ацаніць на свае вочы маштаб нашай прапановы, і ўжо тады рабіць свой выбар. Дваццаць гадзін, Якуб — гэта той час, які аддзяляе вас ад доказаў.

— Я ўсё яшчэ не разумею, што значыць

гэты адрэзак часу.

— Гэта дарога, якую нам з вамі давядзецца пераадолець.

— Вы хочаце сказаць, што я павінен праляцець паўсвету, каб убачыць тое, што вы хочаце мне паказаць?

— Менавіта. Роўна столькі ў нас зойме пералёт на самалёце, які чакае нас тут, у Швешахце. Гэта з улікам дазапраўкі на Карыбскіх выспах.

— Чалавек, з якім была ў вас запланавана сустрэча ў Вене...

— Не ведаў, пра яе, Якуб. Гэта былі вы.

— Я абяцаў дачцэ, што сёння вярнуся да яе.

— Вы потым папросіце прабачэння перад ёй.

— Гэта нейкі страшны сон.

— Зусім не, Якуб. Вы толькі што атрымалі самую важную прапанову ў сваім жыцці. Хіба гэта можна назваць страшным сном?

Гор падняўся.

— Вы гатовыя адправіцца са мной? Ці мы развітаемся тут?

— Чорт бы вас пабраў. Вы ўявілі сябе Белым Трусам з Краіны цудаў, а мяне хочаце прымусіць згуляць ролю Алісы.

— Гэта не зусім дакладнае параўнанне, аднак, калі яно вам да душы, я не буду з ім спрачацца.

Я цяжка ўстаў.

— Мне трэба будзе патэлефанаваць дачцэ.

— Вы зможаце зрабіць гэта ў самалёце, доктар Глінскі.

— Адкуль мне ведаць, што вы не хочаце нашкодзіць мне?

— О, я клянуся вам, што прымяню гвалт толькі ў тым выпадку, калі самалёт пачне падаць, і мне давядзецца, у адпаведнасці з вашым жа пажаданнем, зламаць вам шыю.

— Хадзем.

Гор падхапіў маю сумку ў свабодную руку і, не азіраючыся, пайшоў да выхаду з транзітнай залы.

## 4. Самалёт да вострава Роса

Гор упэўненым крокам ішоў праз памяшканні, не прызначаныя для знаходжання там пасажыраў. Яго ніхто не спрабаваў спыніць: верагодна, ён не першы раз бываў тут. На гэта ж паказвала і тое, што ён выдатна ведаў, куды трэба ісці, без усялякіх указальнікаў.

Нарэшце, абмінуўшы мноства падсобных памяшканняў, мы выйшлі да аўтаматычных дзвярэй, што вялі на лётнае поле. Тут нас чакаў мікрааўтобус.

Араб адчыніў перада мной дзверы і, пасля таго, як я сеў унутр, паставіў побач мой партфель. Сам ён аддаў перавагу месцу побач

з кіроўцам.

— Вы калі-небудзь ляталі на самалётах тыпу Falcon 900, Якуб? — азірнуўся ён.

— Не даводзілася. Гэта ж невялікі прыватны самалёт, а я небагаты палітолаг, вы памятаеце? Я лятаю камерцыйнымі рэйсамі, і, памятаецца, вы яшчэ нядаўна мне сцвярджалі, што таксама не надта любіце персанальны авіятранспарт.

— Я не схлусіў вам. Гэты самалёт не мой і нават не чалавека, на якога я працую. Ён належыць адной з яго арганізацый. Той самы, пра які я казаў вам, што ён патрэбны для справы. Гэта выдатная машына, яна як нельга лепш падыходзіць для доўгіх і цяжкіх пералётаў. Вы закахаецеся ў гэты самалёт, Якуб, я ўпэўнены. Пасля ўсяго, на чым вы ляталі раней, гэта як «Кадылак» у параўнанні з трактарам. Хоць, пацвярджаючы свае ранейшыя словы, я магу сказаць, што, калі б я валодаў гэтым самалётам, ведаючы выдаткі на адзін пералёт, я ўсё роўна аддаў бы перавагу таннаму крэслу 767-га, чым дарагому месцу ў «Фальконе». Вось, дарэчы, і ён.

Наперадзе сапраўды паказаўся сілуэт зусім невялікага авіялайнера, які я пару разоў бачыў у кіно.

Трап стаяў прыстыкаваны да самалёта, каля яго нас сустракаў экіпаж, які складаўся